Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЛЮТАГА 2017 г. СЕРАДА № 36 (28400)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Іван Міско: мастак з трэцяга разу

СТАР. 4

Новая «Чарнобыльская» стратэгія

Як жыць пасля псіхушкі

СТАР. 13

Фота БЕЛТА.

ДРАЙВ ПА-БЕЛАРУСКУ

Спартыўна-тэхнічнае свята «Беларускі драйв» адбылося 18 лютага ў парку імя Н. Грэкавай у Мінску. У праграме — мотаэстафета сярод вучняў ад 9 да 14 гадоў, інтэрактыўныя станцыі па вывучэнні Правілаў дарожнага руху, забаўляльныя пляцоўкі і палявая кухня.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:

«За мінулы год мы зрабілі пэўныя крокі ў сацыяльна-эканамічным развіцці. У якасці пацвярджэння можна прывесці некаторыя лічбы. У прыватнасці, такі важны паказчык, як экспарт прадукцыі, вырас на 11%. Рэгіён выканаў заданні па інвестыцыйнай дзейнасці. У эканоміку вобласці прыцягнута каля $80 млн прамых замежных інвестыцый. Рэалізавана некалькі цікавых праектаў, пабудаваны новыя прадпрыемствы і заводы, а гэта новыя працоўныя месцы. Дарэчы, заданне па працоўных месцах вобласць таксама выканала».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.02.2017 г.

Долар ЗША	1,8751	▼
Еўра	1,9833	▼
Рас. руб.	0,0323	■
Укр. грыўня	0,0693	▼

ISSN 1990 - 763X

Полымя пад капотам

Як засцерагчы аўто ад пажару?

За мінулы год аўтамабілі ў краіне гарэлі 388 разоў. На долю парушэнняў правілаў эксплуатацыі прыпалі 143 выпадкі. Часцей за ўсё прычынай пажараў станавілася кароткае замыканне. Радзей — заводскі брак і няспраўнасць паліўнай сістэмы.

— Замыканне ўзнікае з-за перагрузкі, зносу ізаляцыі ці ўвогуле яе адсутнасці, — расказвае афіцыйны **прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Таксама вадзіцелі мяняюць арыгінальныя сертыфікаваныя засцерагальнікі на самаробныя. У месцах злучэнняў утвараюцца няякасныя кантакты. Радзей пажары здараюцца з прычыны няправільнага падключэння клем акумулятара.

Цікава, што з-за праблем з праводкай аўтамабілі часцей за ўсё гараць увосень і ўвесну. Ролю дадатковага правакуючага фактару адыгрывае карозія металу.

СТАР. 3

■ Усё ўлічана!

ТАК БОЛЬШ НЕ ПРАЦОЦІЦЬ

Квадрацыклы цяпер неабходна рэгістраваць

Парадак дзяржаўнага ўліку гэтых транспартных сродкаў будзе зменены з 1 студзеня наступнага года. Акрамя таго, з'явяцца і новыя правілы допуску да кіравання імі: калі раней на квадрацыкле магло ездзіць, груба кажучы, хоць пяцігадовае дзіця, то цяпер гэтая магчымасць захаваецца толькі за ўладальнікамі адпаведнай вадзіцельскай катэгорыі.

Як адзначыў **старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела рэгістрацыйна-экзаменацыйнай дзейнасці і тэхнагляду ўпраўлення ДАІ МУС Андрэй ШАРАНДА**, неабходнасць унесці змены і дапаўненні ў закон «Аб дарожным руху» паўстала з прычыны істотнага росту колькасці адзінак гэтага транспартнага сродку, а адпаведна і звязаных з імі здарэнняў. Асабліва часта яны адбываюцца па віне падлеткаў ці дарослых, якія знаходзяцца за рулём у стане алкагольнага ап'янення.

Каб вызначыцца, якія катэгорыі правоў цяпер спатрэбяцца, для пачатку трэба разабрацца, чаго будзе датычыцца закон. Квадрацыклы — гэта занадта абагульненая і нават умоўная назва, адзінае, пра што яна дакладна кажа, — гэта пра наяўнасць чатырох колаў. Два асноўных тыпы квадрацыклаў, пра якія ідзе гаворка, гэта ATV і UTV. У першым выпадку абрэвіятура азначае машыну, якая прызначана для язды па любым пакрыцці, у другім — машыну для выканання ўтылітарных задач: ад гаспадарчай дзейнасці да актыўнага адпачынку і турызму. Квадрацыклы ATV па-іншаму называюць «снегабалотаходы колавыя малагабарытныя». Яны, у сваю чаргу, дзеляцца на два тыпы: I і II — на квадрацыклах тыпу I прадугледжана месца толькі для вадзіцеля, тыпу II — для вадзіцеля і пасажыра. Аднак гэта не адзіная класіфікацыя, акрамя тыпаў квадрацыклам ATV прысвойваюцца яшчэ і катэгорыі: G, S, Y і T. G — мадэль агульнага прызначэння, S — спартыўная мадэль, Y і T — маладзёжная і пераходная мадэлі адпаведна.

Абавязковая рэгістрацыя ў інспекцыях дзяржтэхнагляду ўводзіцца для снегабалотаходаў колавых малагабарытных ATV тыпу I катэгорыі G і S, а таксама тыпу II катэгорыі G і мотаўсюдыходаў UTV.

СТАР. 3

■ Ва ўрадзе

РАЗДАЧЫ «НЕЗАРОБЛЕНЫХ ГРОШАЙ» НЕ БУДЗЕ

У студзені ВУП у параўнанні з мінулым годам упаў з-за недапастаўак нафты

Прамысловасць і сельская гаспадарка паказалі рост, падзенне — будаўніцтва і рознічны гандаль. Пра гэта паведаміў Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі, падчас чарговага пасяджэння прэзідыума Савета Міністраў. На ім члены ўрада разгледзелі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў студзені бягучага года.

Па словах прэм'ера, належных вынікаў па паказчыках пакуль не атрымана. Удакладненыя лічбы ВУП па студзені — 99,5 працэнта да 2016 года пры прагнозе на першы квартал у 99,6: адставанне на 0,1 працэнта. Паводле слоў Андрэя Кабякова, асноўная прычына — недапастаўка нафты з Расійскай Федэрацыі. «Год таму мы перапрацавалі ў студзені нафты на 0,8 мільёна тон больш. За кошт гэтага фактару страцілі 3,3 працэнтнага пункта ў прамысловасці, 4,5 — у аптовым гандлі. У выніку страчана 1,5 працэнта ВУП. Гэта значыць, што пры пастаўцы нафты на ўзроўні мінулага года ВУП склаў бы 101 працэнт», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Пры гэтым ён адзначыў, што кампенсаваць такі адчувальны фактар пакуль не ўдаецца, хоць над гэтым і вядзецца работа.

Кіраўнік урада таксама звярнуў увагу, што ў той жа час выпраўляецца сітуацыя ў прамысловасці. Тэмп росту ў студзені — 105,9 працэнта да таго ж перыяду мінулага года. Прытым у студзені 2017-га на 1,9 працэнта вырас аб'ём вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі. За першы месяц года інфляцыя склала 0,9 працэнта, а ў студзені 2016-га — 1,9.

Таксама Андрэй Кабякоў паведаміў, што рознічны гандаль у студзені асеў на 4,6 працэнта. На думку кіраўніка ўрада, ніхто не адмаўляе ўплыву даходаў насельніцтва на гэты сектар эканомікі, але ў аднолькавых умовах прадпрыемствы сучасных фарматаў гандлю нарасцілі тавараабарот на 8,6 працэнта, а камунальныя гандлёвыя прадпрыемствы знізілі яго на 9,3 працэнта.

Вырашаючы задачу росту заработнай платы, нельга дапусціць перакосаў на спажывецкім рынку, штучнага раскручвання ўнутранага попыту, лічыць прэм'ер. «Пры выкананні задачы па выхаду да канца года на 1 тысячу рублёў сярэдняй заработнай платы будзем зыходзіць з таго, што грошы павінны быць зароблены».

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Разам — супраць карупцыі

«ПЕРАБЛЫТАЛІ» СВАЁ І ЧУЖОЕ

У 2016 годзе ў Мінскай вобласці колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў павялічылася са 158 (у 2015-м) да 311. Найбольш іх зарэгістравана ў Мінскім, Барысаўскім, Маладзечанскім і Салігорскім раёнах. У лідарах за мінулы год сфера дзяржаўнага кіравання, ахова здароўя, сельская гаспадарка, будаўніцтва, прамысловасць. Адпаведна ўзнікае пытанне: гэтыя лічбы сведчаць пра ўзмацненне барацьбы з карупцыяй або пра рост апошняй?

— Гаворка ідзе аб выяўленні эпізодаў злачыннай дзейнасці асоб, якія трапілі ў поле зроку міліцыі. Крымінальная справа ўзбуджаецца па нейкім адным канкрэтным факце, а ўжо ў ходзе следства раскрываецца цэлы шлейф ранейшых злачынстваў, — тлумачыць **пракурор Мінскай вобласці Алег ЛАЎРУХІН**. — Напрыклад, ёсць выпадкі, калі за адным чалавекам стаіць 111 эпізодаў атрымання хабару. Гэта былы інжынер прадпрыемства «Белтэхагляд» па Мінску і Мінскай вобласці, які адказваў за допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху. Фігурант крымінальнай справы займаў гэтую пасаду з 2013 па 2015 гады, пачаў браць хабар у 2014-м. Акрамя таго, яму інкрымінуецца серыя махлярскіх дзеянняў: браў у людзей грошы і абяцаў унесці ў касу, але клаў сабе ў кішэню. У цэлым жа ён унёс у скарбонку Міншчыны 140 эпізодаў злачыннай дзейнасці. Мужчыну пагражае ад 5 да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Завяршаецца расследаванне крымінальнай справы ў адносінах да галоўнага спецыяліста ўпраўлення антыманапольнай і цанавой палітыкі Мінаблвыканкама. Жанчына праводзіла праверкі на прыватных і дзяржаўных прадпрыемствах гандлю. Вядома, у гэтай сферы парушэнняў хапае. Таму падазраваная абяцала прадпрымальнікам, службовым асобам спрыяльна рашыць пытанне за ўзнагароду. Падчас следства ўстаноўлена 20 эпізодаў злачынства.

Яшчэ адзін рэкардсмен — былы генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Мінаблаўтатранс». Яму інкрымінуецца крадзеж маёмасці прадпрыемства, злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, у тым ліку шляхам выкарыстання працы падначаленых на аб'ектах, якія належалі яму асабіста. Усяго выяўлена 13 эпізодаў злачынства. Нанесеныя страты таварыству перавышаюць 400 млн рублёў. На яго маёмасць накладзены арышт у памеры 500 тыс. долараў.

Восем крымінальных спраў заведзена летась па матэрыялах пракурорскіх праверак выканання заканадаўства па барацьбе з карупцыяй. Так, старшыня Астрашыцкагарадоцкага сельвыканкама Мінскага раёна выдала афіцыйныя дакументы для рэгістрацыі на тэрыторыі сельсавета дачкі сваёй сяброўкі. Гэта дазволіла паставіць яе на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і прадаставіць у прыватную ўласнасць зямельны ўчастак на льготных умовах для будаўніцтва дома. У выніку дзяржаве нанесены страты ў памеры больш чым 13 тыс. рублёў.

Летась органамі пракуратуры ў цэнтральным рэгіёне выяўлена 336 фактаў парушэння антыкарупцыйнага заканадаўства. Па патрабаванні пракуратураў Мінскай вобласці 200 чалавек прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці, 75 — да адміністрацыйнай, 36 — да матэрыяльнай, шэсць пазбавіліся займаемых пасад.

— Карупцыя ёсць у любой краіне свету, — разважае пракурор. — Звесці яе да нуля немагчыма, паколькі на яе ўплывае чалавечы фактар. Чаму чалавеку, які распараджаецца дзяржаўнымі грашыма або маёмасцю, складана не пакласці чужое ва ўласную кішэню? Мяркую, тут пытанне маральнага плана. Акрамя таго, карупцыйныя злачынствы глыбока латэнтныя: хабарнікаў выяўляць складана.

Метады па выяўленні такіх фактаў павінны ўдасканальвацца з боку аператыўных службаў. Важна, каб людзі ведалі, што рана ці позна злачынныя дзеянні стануць здабыткам грамадскасці і суда. Разам з тым, лічыць Алег Лаўрухін, неабходна развіваць сферу грамадскага кантролю. Работнікі, якія працуюць у арганізацыях, на прадпрыемствах, ведаюць, чым займаецца кіраўнік. «Сістэма грамадскага кантролю супрацьдзеяння карупцыі, як адзін са сродкаў прафілактыкі, мае права на жыццё, — адзначыў пракурор, — і будзе развівацца. Такая норма ўнесена і ў Закон аб барацьбе з карупцыяй. Будзем глядзець, аналізаваць, як яна працуе».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

■ Дэкрэт №3

АДНЫ НЕ МАГЛІ ПРАЦАВАЦЬ, ДРУГІЯ НЕ ХАЦЕЛІ

Паведамленні аб неабходнасці заплаціць збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў былі накіраваны 130 жыхарам Тамашоўскага сельсавета Брэсцкага раёна. Як паведаміла старшыня сельвыканкама Алена БУРАК, з іх паўдзясятка былі памылковымі. Напрыклад, дакумент атрымала дзяўчына, якая вучыцца на шостым курсе медыцынскага ўніверсітэта, таксама хлопец, які служыў у арміі, і жанчына, што некалькі гадоў бесперапынна працуе. Механічныя памылкі былі выпраўлены лёгка, пра агрэхі паведамілі ў падатковую інспекцыю.

Мясцовы орган улады не можа вызваліць ад плацяжу, а вось парэкамендаваць гэта зрабіць раённай камісіі, дапамагчы грамадзяніну сабраць дакументы, падказаць чалавеку, куды звярнуцца, — у кампетэнцыі сельскага Савета. У Тамашоўцы знайшліся людзі, якія працяглы час даглядалі хворых сваякоў, таму не маглі працаваць ва ўказаны тэрмін.

— Стан здароўя хворых альбо інвалідаў таксама бывае розным. У адным выпадку догляд можна сумяшчаць з працай, у другім — не, — разважае Алена Іванаўна. — Пасля кожнага звароту мы выязджалі і разбіраліся на месцы. Так, напрыклад, унук даглядаў бабулю з анкалагічным захворваннем. Там склалася сітуацыя, калі пры хворай трэба было знаходзіцца ўвесь час. І гэты прыклад не адзінкавы. У асноўным з прычыны догляду хворых родных раённая камісія ўжо вызваліла ад аплаты поўнасцю ці часткова 13 чалавек з вёсак нашага сельсавета.

У ходзе праверак спецыялісты сельвыканкама выявілі і такія прыклады, якія патрабуюць умяшання заканадаўцаў. Скажам, жонка афіцэра-пагранічніка, знаходзячыся фактычна ў лесе, аб'ектыўна не можа знайсці сабе работу. А паводле цяперашніх нормаў, няма падстаў вызваліць яе ад аплаты. Такі радок варта дапісаць у нарматыўныя дакументы, лічаць у сельсавеце. Ды і некаторыя вясковыя жыхары ў пэўны перыяд не маглі знайсці работу. Да падобных зваротаў таксама трэба паставіцца ўважліва.

А вось большасць з тых, хто атрымаў лісты з падатковай, павінны плаціць збор. Рэч у тым, што Тамашоўскі сельсавет знаходзіцца на мяжы з дзвюма дзяржавамі — Украіны і Польшчы. Раней, калі ва Украіну доступ па лясных дарогах быў фактычна бесперашкодным, тут сфарміравалася праслойка вяскоўцаў, якія ніколі не працавалі, а жылі вельмі нават прыстойна. У іх адбудаваны добрыя дамы, ёсць нятанныя машыны, стабільны дабрабыт у сям'і. Можна толькі здагадвацца пра крыніцы. Зараз, пасля дэмаркацыі мяжы, гэтыя людзі пераключыліся на легальныя паездкі ў суседнія краіны і займаюцца малым бізнесам. Яны карыстаюцца ўсімі сацыяльнымі выгодамі, атрымліваюць даход, яны і павінны плаціць падаткі. Некаторыя ўжо і заплацілі, — паведамілі ў мясцовым органе ўлады.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda@by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Пастаянны прадстаўнік Расіі пры ААН Віталь Чуркін памёр у Нью-Ёрку за дзень да свайго 65-годдзя

На дыпламатычную службу ён паступіў у 1974 годзе, у 1992-м стаў намеснікам міністра замежных спраў Расіі. З 1994 па 1998 год — пасол Расіі ў Бельгіі, пастаянны прадстаўнік пры НАТА. У далейшым займаў пасаду пасла ў Канадзе, пасла па асобых даручэннях. З красавіка 2006 года — пастаянны прадстаўнік Расіі пры ААН. Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падпісаў указ аб узнагароджанні Віталя Чуркіна ордэнам Мужнасці. Як паведаміла прэс-служба Крамля, узнагарода прысуджана «за самаадданасць, стойкасць і высокі прафесіяналізм, праяўленыя на пасадзе пастаяннага прадстаўніка Расійскай Федэрацыі пры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Ёрку».

Мехрыбан Аліева прызначана першым віцэ-прэзідэнтам Азербайджана

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў прызначыў сваю жонку Мехрыбан Аліеву першым віцэ-прэзідэнтам рэспублікі. Пад старшынствам Аліева адбылося пасяджэнне Савета бяспекі краіны. На ім кіраўнік дзяржавы прадставіў першага віцэ-прэзідэнта. Паводле канстытуцыі Азербайджана, першы віцэ-прэзідэнт бярэ на сябе паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы, калі той не здольны выконваць свае абавязкі.

The Independent заінтрыгавала чытачоў дзіўным здымкам

Брытанскае выданне The Independent апублікавала фатаграфію, на якой адлюстравана пара на беразе возера, і прапанавала чытачам знайсці на здымку трэцяга чалавека. Тым, хто не справіўся з задачай, журналісты падказалі разгадку. У навісаючых галінах на версе здымка праглядаецца контур немаўляці. Многія карыстальнікі Twitter, каментуючы малюнак, адзначалі, што газета апублікавала памылковы адказ, паколькі трэцім чалавекам насамрэч з'яўляецца фатограф, які знаходзіцца за кадрам.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

Продавец: ОАО «АТЭК» г. Витебск, ул. Терешковой, д. 11, 8 (0212) 26-12-10
Лот №1. 19/1000 долей (площадь 140,1 кв. м) в праве собственности на капитальное строение с инв. №200/С-54163 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – главный производственный корпус. Нач. цена: 54 233 руб. без НДС. Задаток: 5 423,30 руб.
Лот №2. 11/1000 долей (площадь 82,1 кв. м) в праве собственности на капитальное строение с инв. №200/С-54163 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – главный производственный корпус. Нач. цена: 31 781 руб. без НДС. Задаток: 3 178,10 руб.
Лот №3. 13/1000 долей (площадь 95,2 кв. м) в праве собственности на капитальное строение с инв. №200/С-54163 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – главный производственный корпус. Нач. цена: 36 852 руб. без НДС. Задаток: 3 685,20 руб.
Лот №4. 84/1000 долей (площадь 635,2 кв. м) в праве собственности на капитальное строение с инв. №200/С-54163 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – главный производственный корпус. Нач. цена: 245 888 руб. без НДС. Задаток: 24 588,80 руб.
Лот №5. 13/1000 долей (площадь 98,8 кв. м) в праве собственности на капитальное строение с инв. №200/С-54163 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – главный производственный корпус. Нач. цена: 38 246 руб. без НДС. Задаток: 3 824,60 руб.
Дата, время и место проведения аукциона: 27.03.2017 в 10.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 22.02.2017 с 8.30 по 24.03.2017 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Обременения: договоры аренды сроком: по лоту №1 до 28.02.2018, по лоту №2 до 31.08.2017, по лоту №4 до 04.01.2018, по лоту №5 до 31.12.2017. Капитальное строение расположено на земельном участке площадью 1,3678 га с кадастровым номером 240100000001011454 по адресу: г. Витебск, ул. Терешковой, 11

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

■ Не абмініце!

СТВАРАЕМ СЯБЕ — ПРАЗ ЧЫТАННЕ

Распачаўся рэспубліканскі творчы конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка»

Вучні розных школ чыталі вершы беларускіх паэтаў пра родную мову, пра Мінск і Полацк. Афіцыйныя асобы былі асабліва натхнёныя і ўзрушаныя. Менавіта так, у цёплай і ўтульнай атмасферы свята, стартаваў конкурс «Жывая класіка». Яго заснавальнікамі сталі Міністэрства інфармацыі, Міністэрства адукацыі, Саюз пісьменнікаў Беларусі і Сталічнае тэлебачанне.

Фота Надзеі БУЖАН.

Падчас урачыстага пачатку конкурсу «Жывая класіка» ў Міжнародны дзень роднай мовы гучалі вершы беларускіх паэтаў.

Конкурс, што мае на мэце прыцягнуць увагу грамадскасці да праблематыкі чытання, пашырыць кругагляд чытачоў, падтрымліваць таленавітую моладзь, будзе доўжыцца да верасня і пройдзе ў некалькі этапаў: ад школьнага да рэспубліканскага.

— Развіццё ў дзяцей цікавасці да слова, найлепшых узораў беларускай літаратуры сёння павінна стаць клопатам дарослых. Таму што чытанне — развіццё асобы, спасціжэнне назапашанага ў кнігах вопыту, канкурэнтаздольнасць у нашым бурлівым інфармацыйным свеце, — заўважыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Трэба шукаць новыя формы работы з дзецьмі і бацькамі. Мы бачым, што ў краіне выдаецца многа добра аформленых кніг, яны з'яўляюцца на паліцах кнігарняў. Сёлета, калі мы адзначаем 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, надзвычай актуальна гучыць радок з Францыска Скарыны «Найлепшыя скарбы — чалавечыя словы».

Міністр інфармацыі прыгадала, што калі вучылася ў 9-м класе, сама ўдзельнічала ў рэспубліканскім конкурсе юных чытальнікаў. Нават мае грамату за найлепшае чытанне верша пра Янку Купалу.

— Думаю, што і для ўдзельнікаў конкурсу «Жывая класіка» гэтае спаборніцтва стане ўражаннем на ўсё жыццё, — сказала Лілія Ананіч.

— Конкурс «Жывая класіка» — сапраўднае свята, якое павінна даць пачатак творчаму ўзлёту нашай моладзі, — лічыць **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** — Адметна, што яго вынікі будуць падведзеныя ў Полацку падчас Дня беларускага пісьменства і святкавання 500-годдзя нашага кнігадрукавання. Сімвалічна, што Полацк сёлета вызначаны маладзёжнай сталіцай Беларусі.

Так, найлепшыя чытальнікі з усёй краіны стануць удзельнікамі вялікага рэспубліканскага свята, а пераможцы конкурсу «Жывая класіка» ў ліку іншых падарункаў атрымаюць пуцёўкі ў Нацыянальны лагер «Зубраня».

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

■ Рэзанансная справа

«У яго было шызоіднае расстройства...»

У судзе выступіў псіхіятр Казакевіча

Працягваецца суд над Уладзіславам Казакевічам, які ўчыніў расправу бензапілой у гандлёвым цэнтры «Еўропа». Хлопца абвінавачваюць па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса: падрыхтоўка да злачынства, забойства, хуліганства. «Звязда» сочыць за ходам падзей.

У якасці сведкі выступіў псіхіятр, які кансультаваў Казакевіча. Яўген Ласы, супрацоўнік Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, у 2014 годзе быў запрошаны ў РНПЦ псіхічнага здароўя, дзе лячыўся Уладзіслаў пасля спроб суіцыду.

— Гэта была кансультацыя на працягу 20—30 хвілін, — успамінае Яўген Ласы. — Я памятаю, што ён паступіў праз суіцыдальныя дзеянні. Быў канфлікт са школай, звязаны з настаўнікамі. Я шмат кансультую, гэта была руцінная практыка.

Тады Казакевічу паставілі два дыягназы — умерана-дэпрэсіўны эпізод і шызоіднае расстройства асобы. Першы азначае, што ў хлопца былі сімптомы крызіснага стану, зніжаны настрой, суіцыдальныя думкі, ён мог зрабіць небяспечныя для сябе дзеянні. Другі дыягназ характарызуецца незвычайнасцю мыслення, парадаксальнасцю ўчынкаў.

У шызоіднага расстройства, удакладніў Яўген Ласы, ёсць і іншыя сімптомы: паглыбленасць ва ўнутраны свет, арыентацыя на ўласныя фантазіі, складанасці з сацыяльнай адаптацыяй, холаднасць.

— Гэтыя расстройствы, як правіла, захоўваюцца на доўгі час, — расказаў у судзе псіхіятр. — Для людзей з расстройствамі асобы няма працяглага адэкватнага лячэння. Лячэнне неабходна толькі ў крызісныя моманты. Тады прызначаюцца антыдэпрэсанты, псіхатэрапія.

Вядома, што Казакевіч камплексаваў праз сваю знешнасць. Яўген Ласы заўважыў, што праблемы з успрыняццем свайго цела з'яўляюцца псіхатраўміруючым фактарам, які можа ўскладніць сітуацыю.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Май на ўвазе

Рэспубліканская алімпіяда па менеджменце

Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі Беларусі аб'явіў аб правядзенні ў 2017 годзе чацвёртай алімпіяды па менеджменце, якая нацэлена на павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі маладых спецыялістаў краіны ў галіне менеджменту, развіццё іх творчага і прафесійнага патэнцыялу, прасоўванне ідэй якасці ў маладзёжным асяроддзі.

Алімпіяда праводзіцца ў межах міжнароднага. Глабальнага праекта «Маладзёжны творчы рух «Эстафета якасці». У ёй могуць прымаць удзел студэнты і магістранты ўстаноў вышэйшай адукацыі краіны, а таксама спецыялісты ва ўзросце да 30 гадоў, чыя прафесійная дзейнасць звязана з якасцю прадукцыі і паслуг. Алімпіяда праводзіцца ў два этапы.

На першым этапе ўдзельнікі сёлета да 1 сакавіка накіроўваюць заяўкі і рэфераты ва ўстановы вышэйшай адукацыі (у тым выпадку, калі яны з'яўляюцца студэнтамі/магістрантамі) або сакратарыят Рэспубліканскай экспертнай камісіі (далей — сакратарыят), створанай на базе Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь (Дзяржстандарт) і Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС).

Для ўдзелу ў алімпіядзе **ў другім этапе** ўстановы вышэйшай адукацыі да 15 красавіка 2017 года перадаюць дакументы фіналістаў у сакратарыят з суправаджальным лістом і вынікамі ацэнкі па вызначаных крытэрыях. Другі этап алімпіяды арганізуецца і праводзіцца ў БелДІСС. Удзельнікі праходзяць тэсціраванне, вырашаюць сітуацыйныя задачы, прадстаўляюць прэзентацыі, падрыхтаваныя на аснове рэфератаў.

Заяўкі на ўдзел у алімпіядзе прымаюцца ў сакратарыяце Рэспубліканскай экспертнай камісіі па адрасе: — 220113, г. Мінск, вул. Мележа, д. 3, к. 805. Тэлефон: (017) 269 69 64; факс: (017) 269 69 54; e-mail: ntc@belgiss.by.

Больш падрабязна аб умовах правядзення алімпіяды можна даведацца на сайце нашай газеты: www.zviazda.by.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

Полымя пад капотам

6 хвілін паміж замыканнем і пажарам

— Не рэкамендуецца курыць у салоне аўтамабіля, — працягвае Віталь Навіцкі. — Па-першае, пажар могуць справакаваць пары ад паліва. Па-другое, здараліся выпадкі, калі запаленая цыгарэта кудысьці завальвалася, і дастаць яе аператыўна не паспявалі. Тут жа пачыналі тлець і загарацца сядзенні і дыванок. Яшчэ адна памылка — захоўванне ў багажніку каністраў з запасам бензіну, саляркі і масла.

Галоўным памочнікам у тушэнні агню з'яўляецца вогнетушыцель. Гэта вельмі эфектыўны сродак для ліквідацыі пажару ў аўтамабілі на пачатковай стадыі. Прычым дзейнічаць трэба надзвычай аператыўна. Важна памятаць, што ад моманту ўзнікнення кароткага замыкання да сітуацыі, калі з агнём кіроўца нічога зрабіць ужо не можа, звычайна праходзіць 5—6 хвілін.

— У продажы ёсць два тыпы вогнетушыцеляў: парашковы і вуглекіслотны, — расказвае Віталь Навіцкі. — Які з іх найлепшы — сказаць цяжка. І той, і другі прыкладна аднолькавыя датычна выкарыстоўвання. Адзінае «але», пра якое трэба памятаць: вуглекіслотны вогнетушыцель выкідвае з раструба газавую сумесь, тэмпература якой каля мінус 50 градусаў. Таму з ім трэба быць даволі асцярожным. Лічыцца, што парашок патушыць агонь крыху хутчэй, але вуглекіслотны апарат больш ашчадны да аб'екта ўзгарання. Таксама важнае пытанне — якім павінен быць аб'ём вогнетушыцеля? Малым літровым апаратам можна патушыць хіба што палаючую попельніцу. Таму ён з'яўляецца проста фармальнасцю для праходжання тэхнічнага агляду. Але ж яго задача зусім не ў гэтым — а каб за 6 хвілін узяць сітуацыю пад кантроль. А вось узброіўшыся вогнетушыцелем аб'ёмам у 2 літры, уважлівы кіроўца справіцца з узгараннем на пачатковай стадыі. Менавіта таму ён лічыцца самым аптымальным.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пазбегнуць памылкі

У большасці выпадкаў дымком пачынае цягнуць з-пад капота. А вось тут і ўзнікае вельмі важная праблема. Поўнасцю адчыняць яго нельга: тут жа ў аўтамабіль пранікне кісларод, які распаліць агонь яшчэ мацней. Да таго ж у сучасных машынах капот адчыняецца кнопкай, якая знаходзіцца на прыборнай панэлі. А вось адкрыцца ён можа на любую вышыню! Пра гэтую асаблівасць трэба падумаць загадзя і пры магчымасці адрэгуляваць пад'ём крышкі капота на сэрвісным цэнтры.

Да таго ж металічныя часткі аўтамабіля імкліва награваюцца. Таму вазіце з сабой тканевыя несінтэтычныя пальчаткі. Канешне, ідэальнай абаронай іх назваць нельга, але на некалькі секунд, каб прыўзняць крышку капота і засунуць туды раструб вогнетушыцеля, іх хопіць.

— Тыповая памылка падчас тушэння аўтамабіля — выдаць пад капот за раз усё змесціва балона, — кажа Віталь Навіцкі. — А калі дробны ачаг прыхаваўся недзе ў глыбінях агрэгатаў? Наўрад ці вы возіце з сабой некалькі балонаў. Таму першы этап работы вогнетушыцеля не павінен перавышаць у ідэале 5—6 секунд. Пасля гэтага паглядзіце: ідзе дымок з-пад капота ці не? Калі ніякіх прыкмет агню няма, капот можна вельмі павольна асцярожна прыадкрыць. І быць гатовым да таго, што зноў давядзецца ўжыць вогнетушыцель. Акрамя таго, абавязкова паведаміце аб узгаранні па нумары 101.

А калі за першыя хвіліны не ўдалося патушыць агонь, то апошняе, што застаецца, — адбегчы на максімальна бяспечную адлегласць, каб не пацярпець ад дэтанацыі паліва. Асабліва гэта датычыцца аўтамабіляў з газавым абсталяваннем.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

ТАК БОЛЬШ НЕ ПРАКОЦІЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першы час працэдура рэгістрацыі будзе насіць спрошчаны характар. Калі машына ўжо знаходзіцца ў эксплуатацыі, то рэгістраваць яе будуць па заяве. Не варта баяцца адсутнасці неабходных папер, напрыклад, даведак з завода-вытворцы або дакументаў, выдадзеных мытнымі органамі. Уладальніку транспарту ў заяве дастаткова ўказаць абставіны яго набыцця, і рэгістрацыя будзе праведзена, але з пэўнымі абмежаваннямі, якія забараняюць зняцце з уліку на працягу трох гадоў, выключэнне — выпадкі выбракоўвання, адпаведны запіс будзе ўносіцца ў рэгістрацыйныя дакументы.

«Па сутнасці, права кіраваць квадрацыкламі будуць мець усе тыя, у каго ёсць пасведчанне кіроўцы на ваджэнне механічнага транспартнага сродку, за выключэннем катэгорыі АМ і падкатэгорыі А1 (мапеды і матацыклы, аб'ём рухавіка якіх не перавышае 125 куб. см, і з магутнасцю да 11 кВт адпаведна), ці пасведчанне трактарыста-машыніста. Гэта будзе служыць гарантыяй таго, што чалавек знаёмы з правіламі дарожнага руху, мае навыкі язды, а таксама прайшоў медыцынскі агляд», — падкрэсліў Андрэй Шаранда.

Аднак усе астатнія вышэйназваныя тыпы машын у адпаведнасці са сваімі тэхнічнымі характарыстыкамі і асаблівасцямі канструкцыі не прызначаныя для ўдзелу ў дарожным руху. Мабыць, такі «ўціск» выводзіць уладальнікаў квадрацыклаў з сябе, і быццам у адплату наўзамен дарогам яны выбіраюць сельскагаспадарчыя ўгоддзі. Пры гэтым на тое, каб «загаіць раны», пакінутыя імі на зямлі, ідзе нямала часу. А кіроўцы ў абавязковым парадку павінны выбіраць для перамяшчэння толькі тыя месцы, выкарыстанне якіх не стварае пагрозы для іншых грамадзян і не наносіць шкоды навакольнаму асяроддзю. Менавіта ўвядзенне абавязковай рэгістрацыі дазволіць наладзіць механізм пакарання парушальнікаў правілаў і вінаватых у здарэннях. Тым не менш ужо цяпер супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі сумесна з іншымі дзяржаўнымі органамі актыўна праводзіцца маніторынг правамернасці выкарыстання гэтага тыпу транспарту.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*



ЧАЛАВЕК-КОСМАС

Народны мастак Беларусі Іван Міско напярэдадні свайго 85-годдзя расказаў «Звяздзе» пра самае запаветнае

Яго заўсёды можна знайсці ў сваёй майстэрні (цяпер майстэрні-музеі). Тут скульптар і ў выхадныя дні. Як прызнаецца майстар, выхадныя — гэта свята, а іх лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і прэміі Саюзнай дзяржавы прызвычаіўся праводзіць з глінай у руках.

З гэтым высакародным матэрыялам, як называе гліну сам майстар, Іван Міско не расстаецца ўжо на працягу шасці дзесяцігоддзяў. Мастак кажа, што няма больш паслухмянага матэрыялу, і параўноўвае яго з золатам, якое дае яму сілы тварыць.

Мы сядзім у майстэрні ў акружэнні бронзава-гіпсавых касманаўтаў, а таксама іншых вядомых асоб і гутарым пра любоў да мастацтва і яе вытокі.

Дзедава праўда і выхаванне па-бацькоўску

— Я не помню сваю бабку, затое добра памятаю дзеда — Сцяпана Сцяпанавіча Міско, — пачынае Іван Якімавіч. — Дзед мяне вельмі любіў, заўсёды нешта для мяне гатаваў. А аднойчы ён расказаў праўду. Калі дзед паехаў сватацца да сваёй будучай нявесты (гэта было зімой), някепска выпілі. Пакуль даехалі, яго ў санях не аказалася: страцілі па дарозе. Другі раз сватаўся ўжо да іншай. Сёння я думаю, а можа, і добра, што дзед да першай нявесты не даехаў: хто б тады замест мяне нарадзіўся?

Дзяцінства будучага народнага мастака прайшло на Слонімшчыне. Вакол — лес. Непадалёку ад хаты працякала рэчка Валобрынка. На хутары ён нарадзіўся, адсюль пайшоў у школу, а потым і ў армію. Тут застаў і 1939 год, і Вялікую Айчынную...

Бацька Івана Міско ў вайну быў партызанскім сувязным, на фронт забралі пасля вызвалення Беларусі, дайшоў да Берліна. «Калі вярнуўся, я папрасіў надзець яго кашулю, — расказвае скульптар. — Каўнер вялікі-вялікі, прыйшлося зрабіць два «гармонікі» і зашыць, але так, каб узнагароды былі відаць. Гэтак і хадзіў па вёсцы. Мне хацелася пахваліцца, які ў мяне бацька!»

Пасля вайны Якім Міско працаваў лесніком. Любоў да прыроды прывіваў і адзінаму сыну.

— Ну а выхаванне якое было? — згадвае мастак. — У адным куце вісела папруга, у другім — абраз. Бацька ніколі не сварыўся, проста паказваў на кут з папругай. І толькі ад гэтага адно месца ўжо пачынала свярбець. Але здаралася, што прымянялася яна па прызначэнні. І гэта нядрэнна.

Мастак з трэцяга разу

Як прызнаецца скульптар, ніхто для яго прафесію не выбіраў. Маляваць пачаў яшчэ ў школе. І не толькі на паперы.

— У хаце стаяла вялікая руская печ, — успамінае Іван Міско. — Калі бацькі ішлі ў горад або на работу, я залазіў у яе, даставаў вуглі і на добра пабеленай печы маляваў пейзажы. А тым часам думаў, што калі прыйдзе маці або бацька, то як адлупяць! Але за печ ніхто ні разу не сварыўся. Аднойчы ў хату зайшоў сусед і, убачыўшы маё маляванне, пытае ў маці: «А хто гэта тут у вас малюе?» — «Дык гэта мой сынок», — адказвае маці. — «Ванька? Дык ён, можа, будзе мастаком?» — выказаў здагадку сусед.

Так і атрымалася. Непісьменныя бацькі, якія ўсё жыццё займаліся сельскай гаспадаркай, выхавалі мастака, імя якога праз шмат гадоў стала вядомае не толькі беларусам, а і за межамі нашай краіны. А між іншым, шлях да мастацтва ў Івана Міско быў зусім не простым.

«Калі бацькі ішлі ў горад або на работу, я залазіў у печ, даставаў вуглі і маляваў на ёй пейзажы».

— Калі я ўпершыню паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча, то першую ноч спаў пад сталом у адным з яго пакояў, — расказвае Іван Якімавіч. — Рэчмяшок, у якім былі сухары, клаў пад галаву. Прачнуўся раніцай, а няма ні сухароў, ні грошай...

Тады пачынаючы мастак сабраў усе свае малюнкі і паехаў у вёску. На наступны год прыехаў ізноў. Але як толькі паступіў, яго забралі ў армію. І толькі з трэцяй спробы, ужо пасля службы, ён стаў навучэнцам Мінскага мастацкага вучылішча.

Праз шмат гадоў аднакурснікі расказалі Івану, з-за каго ён першы раз вымушаны быў пакінуць установу. Аказ-

Экіпаж касмічнага карабля «Саюз МС-03», які ўзначальвае наш зямляк Алег НАВІЦКІ, на арбіце азнаёміўся з работамі Івана МІСКО.

ваецца, яго абакраў натуршчык, якога скульптар ляпіў. «Даведаўшыся ўсю праўду, я разбіў яго партрэт, — прызнаецца мастак. — Прайшоў час, і я зразумеў, якое глупства зрабіў. Гэта была мая студэнцкая работа, за якую атрымаў добрую адзнаку. Толькі не мог прабачыць таго, што гэты чалавек мяне абакраў. Ён жа мне пазіраваў, у вочы глядзеў...»

«Пахавалі, але не прадалі!»

Нягледзячы на той выпадак, Іван Міско лічыць, што ў жыцці яму шанцавала. Напрыклад, тады, калі забіралі ў армію...

— Помню, запрасілі ў ваенкамат і кажуць, што не вясной, а восенню забяруць, — гаворыць мастак. — Кажу, як гэта восенню? Пастрыглі, як я вярнуся такім у вёску? Дзяўчаты ж падумаюць, што хворы, хілы, бракаваны, раз у армію не ўзялі. Хто за мяне замуж выйдзе? Тады кажу ваенкаму, што не пайду дахаты! Я быў упарты.

Служыў Іван Міско ў Забайкаллі. Там была магчымасць і маляваць, і ляпіць. А калі вярнуўся з арміі, ужо не паступаў на жывапіснае аддзяленне, а вырашыў усур'ёз заняцца скульптурай.

У 1968 годзе мастак стаў удзельнікам чэхаславацкіх падзей. «У той вечар у парку Горкага адкрылася мая невялікая выстаўка, — успамінае Іван Якімавіч, які тады ўжо працаваў у Нацыянальным мастацкім музеі. — Скончылася ўсё позна, а паколькі я жыў тады ў Чыжоўцы, сябры прапанавалі мне застацца ма прыходзілі на выстаўку...

Але не ўсім прыйшліся тыя карціны даспадобы. За маральнае разлажэнне старшага сяржанта Міско нават хацеў судзіць ваенны трыбунал! «Шчыра кажучы, я спалохаўся: у тых умовах усё магло быць, — прызнаецца Іван Якімавіч. — Але генерал аказаўся настолькі прыстойным чалавекам, што да суда справа не дайшла. Выстаўка працягвалася... Прыйшоў час, калі мы збіраліся з'язджаць у Беларусь. Аб гэтым даведаліся палякі. Прыйшлі да мяне і кажуць, каб я ім прадаў сваіх «кабет». Мы з афіцэрамі параіліся, а яны і кажуць: «Гэтыя жанчыны нам сталі ўжо як жонкі, ні за што не прададзім!» Мы пайшлі ў лес, насеклі галінак, расклалі іх у той жа палатцы, паклалі зверху малюнкі, прысыпалі зямлёй і паставілі драўляны крыж — пахавалі, але не прадалі!»

Зачараваны Сусветам

Іван Міско ніколі не сумняваўся ў тым, што выбраў правільную прафесію. Яго аўтарству належаць скульптуры вядомых людзей, помнікі за мяжой і ў роднай Беларусі: Максіму Горкаму ў цэнтральным мінскім парку, Клімуку ў Брэсце... Але найбольш важным, безумоўна, стаў помнік маці-патрыётцы ў Жодзіне, які Іван Міско стварыў разам з Міхаілам Заспіцкім і Мікалаем Рыжанковым.

З Настассяй Купрыянавай, прататыпам галоўнай гераіні, яны былі знаёмыя асабіста, пастаянна ездзілі да жанчыны і вельмі перажывалі, каб яна дажыла да адкрыцця (відэа-віншаванне, запісанае для юбіляра на касмічнай станцыі, можна паглядзець на www.zviazda.by), не ведае толькі нецікаўны. Іван Міско свой у Зорным гарадку, які стаў для яго другім домам.

Майстэрня як музей і куточак дзяцінства

На адной з паліц у майстэрні мастака бачу партрэт дзяўчынкі. Ён належыць адной з вучаніц 90-й мінскай школы. Былі часы, калі мастак даваў майстар-класы перад школьнікамі. Потым прыносіў скульптуру ў клас, і дзеці пісалі сачыненне аб нараджэнні партрэта іх аднакласніка. Адну з тых работ, партрэт Воўкі, нават купіла Міністэрства культуры.

— Я вельмі хацеў бы ведаць лёс гэтых дзяцей, — кажа Іван Якімавіч. — Калі нехта пазнае сябе, няхай адгукнецца. Магчыма, паляпіў бы іх зноўку.

У майстэрні — сапраўдны музей. Тут не толькі скульптуры, фотаздымкі (Іван Міско нядрэнны фатограф), ёсць і шыкоўная калекцыя аўтографаў. Толькі не на паперы, а на пластыліне або нават адлітыя ў бронзе — у такім выглядзе іх не падробіш, не сатрэш.

У майстэрні — і рэчы з бацькоўскай хаты, якая і дагэтуль стаіць, але там жывуць ужо іншыя людзі. Мы глядзім на кудзелю і абажур, і мастак зноў вяртаецца ў дзяцінства:

— Помню, вечар. За сталом — маці, дзед, бацька, сястра Люба і я. Раптам маці кажа, што трэба прадаць карову: маўляў, малако нятлустае. Бацька пажартаваў, што, можа, гэта Ванька кепска пасе. Наступным разам размова паўтараецца. Я настойваў, што карову прадаваць не трэба. Бацька паглядзеў на мяне і пытаецца, што я нарабіў. Давялося расказаць, што з'ядаю ўсе вяршкі з малака... Іх вельмі любіў, зліваў у шклянку і выпіваў. Пасля гэтага перастаў: мяне мучыла сумленне, што карову могуць прадаць, а потым зарэзаць.

* * *

У Івана Міско яшчэ нямала творчых задум. Ён марыць паставіць помнік Льву Сапегу ў родным Слоніме, ганаровым грамадзянінам якога з'яўляецца, аднаму з найбуйнейшых нашых вучоных Казіміру Семяновічу, французскай мастачцы родам з Барысава Надзеі Хадасевіч-Лежэ, якую добра ведаў. І па-ранейшаму будзе адданым сваёй касмічнай тэматыцы. Мастак не любіць адпачынку і прызнаецца, што яго ніколі не будзе...

Пакуль матэрыял рыхтаваўся да друку, стала вядома, што Федэрацыя касманаўтыкі Расіі ўдастоіла Івана Міско найвышэйшай узнагароды — ордэна Гагарына. У сваю чаргу, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» жадае Івану Якімавічу, які, дарэчы, у свой час з'яўляўся пазаштатным карэспандэнтам нашай газеты, моцнага здароўя, дабрабыту і творчага імпэту!

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
Фота з архіва мастака.

ОАО «Лидапищеконцентраты»

сообщает, что 24 марта 2017 года в 14.00 состоится годовое общее собрание акционеров

Место нахождения общества: Гродненская область, г. Лида, ул. Тавлая,11.
Место проведения собрания: помещение актового зала, расположенного по адресу: Гродненская область, г. Лида, ул. Тавлая, 11.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Лидапищеконцентраты» в 2016 году и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.

2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Лидапищеконцентраты» за 2016 год.

3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2016 год и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков, годовому отчету ОАО «Лидапищеконцентраты». Ознакомление Общества с заключением аудитора.

4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2016 год.

5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2016 год. О выплате дивидендов за 2016 год.

6. О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Лидапищеконцентраты» на 2017 год.

7. Избрание членов наблюдательного совета и членов ревизионной комиссии ОАО «Лидапищеконцентраты».

8. О назначении материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Акционеры (их представители) имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания в рабочие дни с 3 марта 2017 года с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Лида, ул. Тавлая,11 (приемная секретаря руководителя), а в день проведения собрания – во время и в месте его проведения.

Регистрация участников собрания – с 13.00 до 13.50 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 500021268 **Наблюдательный совет**

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

22 лютага 2017 г.
№ 6 (390)

стар. 3

Заўсёды заставацца чалавекам

стар. 6

За кошт чаго трымаецца прыдарожны сэрвіс

стар. 8

Як гэта — жыць на хутары?

ТЭМА ДНЯ

«ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ» СТРАТЭГІЯ

Карэкціроўку «чарнобыльскіх» законаў з улікам меркаванняў навукоўцаў і насельніцтва прапануюць зрабіць члены Савета Рэспублікі

У Гомелі адбылося выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Дэпутаты на практыцы вывучалі дзеянне нормаў законаў, якія датычацца так званых чарнобыльскіх праблем. Размова — пра закон «Аб радыяцыйнай бяспецы насельніцтва», які быў прыняты ў 1998 годзе, і «Аб рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

Сёння ніхто не адмаўляе, што чарнобыльская трагедыя аказала вельмі значны ўплыў на жыццё людзей ва ўсіх кірунках. Але ж час эмоцый даўно мінуў. 30 гадоў з моманту трагедыі — не толькі дата. Гэта лічба супадае з перыядам паўраспаду цэзію-137. І таму навукоўцы гавораць пра іншы перыяд жыцця, а значыць, і час для пераасэнсавання «чарнобыльскіх» законаў.

За 30 гадоў было многа зроблена ў межах Дзяржаўных праграм па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. І сёння не перабольшваннем будзе сказаць, што краіна дастаткова паспяхова спраўляецца з наступствамі радыеактыўнага забруджвання навакольнага асяроддзя.

Падчас наведвання Інстытута радыялогіі і Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека ўдзельнікі выязнога пасяджэння абмяркоўвалі ролю навукі ў адраджэнні і сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёнаў, вядзенне лясной гаспадаркі ва ўмовах радыеактыўнага забруджвання, досвед працы па дыягностыцы і рэабілітацыі грамадзян, што пацярпелі ад наступстваў чарнобыльскай бяды.

стар. 4

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

ДАРОГА ЖЫЦЦЯ

КОЛІШНІ ХУТАР ЗМАГАЕЦЦА ЗА АСФАЛЬТАВАННЕ ДАРОГІ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«Жывём, нібы на востраве... Зімой дарогу замятае снегам, а чысціць не надта хочуць, а калі і чысцяць, то ў апошнюю чаргу. За ўсю зіму дарогу ні разу не пасыпалі ў галалёд пяском. А тут жа ў адзін бок крутая гара, і пад'ехаць вельмі цяжка. Куды ні пішам — адказ адзін: «Не!»

Гэта ліст з рэдакцыйнай пошты, які больш нагадвае крык роспачы. Да «Мясцовага самакіравання» звярнулася Ала Суздалева, жыхарка вёскі Туркаўшчына Валожынскага раёна. Гэта 41 км ад Мінска, калі ехаць напрасткі. Але найкарацейшы шлях — не заўсёды прамая лінія. Бо тое, што на карце з'яўляецца дарогай, на месцы можа аказацца непралазным бездарожжам...

Вяскоўцы і дачнікі

Не ўсе службовыя асобы ідуць на кантакт з прэсай, калі справа датычыць скаргаў. Але кіраўніцтва ДРБУ №167 ахвотна пагадзілася пракаментаваць сітуацыю. І вось разам з Уладзімірам Саевічам, кіраўніком упраўлення, мы вывучаем карту. Туркаўшчына туліцца да краю Валожынскага раёна. Ад райцэнтра да цэнтра сельсавета — аграгарадка Ракаў — пракладзены асфальт. Адтуль да Туркаўшчыны часткова ляжыць асфальтабетон, а месцамі — гравій. А за Туркаўшчынай — садаводчае таварыства «Крышталь». І акурат паміж вёскай і дачным пасёлкам пралягае дарога Н-8345, што на карце пазначана як «гравійка». Працягласць праблемнага ўчастка — 1,4 км. Хоць у чым праблема? Аўтакрама і «хуткая» ходзяць з боку Ракава, а не садаводчага таварыства. А па самой Туркаўшчыне нават ідзе асфальтаваны ўчастак працягласцю 300 метраў.

«Ведаеце, колькі ў нас дарог на балансе? 1230 км! — расказвае Уладзімір Саевіч. — І з іх 565 км — «грунтоўкі» і «гравійкі». Заўважце: гэта не глухія прасёлкі, а дарогі, якімі актыўна карыстаюцца. Рух вельмі інтэнсіўны, бо ў нашым раёне 425 населеных пунктаў. І класці паўсюль асфальтабетон — эканамічна не апраўдана. Таму нарматывы дазваляюць мець гравійнае пакрыццё на другарадных дарогах. Паверце, гэта не найгоршы варыянт! Калі «гравійку» своечасова абслугоўваць, па ёй даволі зручна ездзіць».

Паводле слоў начальніка ДРБУ, мясцовыя жыхары ставяцца да сітуацыі з разуменнем.

стар. 7

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭННЕ ПРЭЗІДЫУМА

Падчас яго парламентарыі абмеркавалі заканадаўчыя і арганізацыйныя пытанні

Пад старшынствам Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, спікера верхняй палаты беларускага парламента, адбылося пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі.

Падчас яго быў разгледжаны ход падрыхтоўкі праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах». Акрамя таго, сенатары вызначыліся з планам міжпарламенцкага супрацоўніцтва Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на першае паўгоддзе 2017 года. А таксама былі вырашаны пытанні, якія датычацца ўдзелу членаў Савета Рэспублікі ў міжнародных мерапрыемствах і ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

СУЧАСНАЯ ЖАНЧЫНА ПАСПЯВАЕ ЎСЁ

Віцэ-спікер Савета Рэспублікі праводзіць прыём грамадзян

Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, сёння праводзіць выязны асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Задаць пытанне віцэ-спікеру верхняй палаты можна з 9.00 да 12.00 у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна сталіцы па адрасе: г. Мінск, вул. Чкалава, 6.

Акрамя таго, на мінулым тыдні Марыяна Шчоткіна ўзяла ўдзел у пасяджэнні прэзідыума грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», старшынёй якога яна з'яўляецца. Падчас мерапрыемства яна абвясціла, што ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў IX Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2016» адбудзецца 18 сакавіка ў Мінску.

«Асноўная задача конкурсу — паказаць ролю жанчын у сучасным грамадстве, іх уклад ва ўмацаванне сям'і, выхаванне дзяцей, сацыяльна-эканамічнае і гуманітарна-культурнае развіццё краіны», — адзначыла старшыня Беларускага саюза жанчын. Паводле слоў Марыяны Шчоткінай, сучасных жанчын характарызуюць фінансавая і псіхалагічная самастойнасць, арыентацыя не толькі на моцную сям'ю, але і на паспяховую кар'еру, духоўнае і творчае развіццё.

Асноўнымі крытэрыямі для ўдзелу ў конкурсе «Жанчына года» з'яўляюцца значныя дасягненні ў прафесійнай і грамадскай дзейнасці, выхаванні дзяцей і моладзі, уклад у развіццё вёскі, духоўнасці і культуры, навукі.

ГАЛОЎНАЕ — ЗАХАВАЦЬ БАЛАНС

У Міністэрстве эканомікі адбылося пасяджэнне калегіі

На мінулым тыдні Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, прыняў удзел у пашыраным пасяджэнні калегіі Міністэрства эканомікі.

Як было адзначана падчас мерапрыемства, галоўным вынікам работы міністэрства стала прыняцце праграмных дакументаў на бягучае пяцігоддзе. Рэалізацыя іх палажэнняў у першым годзе пяцігодкі дазволіла вырашыць складаныя задачы па істотным запаволенні інфляцыі (10,6% па выніках года), своечасовым пагашэнні ўсіх валютных абавязацельстваў краіны, росце золатавалютных рэзерваў, зніжэнні працэнтных ставак па крэдытах.

Найважнейшымі задачамі міністэрства былі вызначаны захаванне макраэканамічнай стабільнасці, паляпшэнне інвестыцыйнага клімату, фарміраванне спрыяльных умоў для вядзення бізнесу. У сферы эканамічнай інтэграцыі адзначана неабходнасць працягвання дзяржорганамі сістэмнай работы па ліквідацыі бар'ераў, выключэнняў і абмежаванняў у гандлі краін Еўразійскага эканамічнага саюза.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

НА ПРЫЁМЕ

ЧАЛАВЕЧЫЯ НОРМЫ НІХТО НЕ АДМЯНЯЎ

Да зваротаў — індывідуальны падыход

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ правёў прыём грамадзян у Віцебску. У мінулую пятніцу ў Віцебскім райвыканкаме ў прысутнасці кіраўніцтва раёна і абласнога Савета заяўнікі агучылі свае праблемы.

«МС» часта асвятляе аналагічныя мерапрыемствы. Але ўпершыню журналіст стаў сведкам такога індывідуальнага падыходу. Напрыклад, пенсіянерка расказала пра немагчымасць стаць уладальнікам жылля ў доме ЖБК. Аляксандр Папкоў паабяцаў, што зварот накіруюць Прэзідэнту.

— Папрашу кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, каб ліст быў перададзены яму на разгляд. Так робіцца толькі, калі ёсць сур'ёзныя пытанні, як у гэтым выпадку. Хоць не разумею, чаму такая праблема ўзнікала. Ваша кватэра, і вы маеце права ёй распараджацца, — разважае сенатар.

Маладая жанчына канстатавала, што ў квартале індывідуальнай забудовы ў прыгарадзе няма вады. У 2009 годзе людзі атрымалі ўчасткі, пабудавалі дамы. Да іх падведзены газаправод і электраэнергія... Прадстаўнікі райвыканкама растлумачылі, што няма фінансавай магчымасці дапамагчы. Сярод іншага ёсць і станцыя абезжалезвання, а водаправод — насамрэч праблема. На пракладку інжынерных сетак ва ўсім раёне з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў на год выдзелены 3 мільярды рублёў. А гэта меней, чым патрабуецца на канкрэтны квартал, пра які расказала заяўніца. Аляксандр Папкоў даручыў сёлета станоўча вырашыць законныя патрабаванні будучых навасёлаў.

Каб вырашыць пытанне рамонту ліўневай каналізацыі, член Савета Рэспублікі зрабіў званок у аблвыканкам. Заяўніца расказала, што ў райцэнтры Сянно жыве яе састарэлая маці. Вада залівае і зямельны ўчастак, і дом. Спадзяваліся, што каналізацыю адрамантуюць напярэдадні абласных «Дажынак» . Яны адбыліся летась. Але... Між іншым, камунальнікі ў адказе жанчыне «адрапартавалі»: усё зроблена! Як высветлілася, толькі на паперы...

Аляксандр ПАПКОЎ (злева) падчас прыёму грамадзян у Віцебскім райвыканкаме.

Беспрацоўны жыхар абласнога цэнтра прасіў уладкаваць яго на работу. На прадпрыемстве не працягнулі кантракт. Ён слесар. Стаіць на ўліку ў цэнтры занятасці, але пакуль прапаноў наконт работы не атрымліваў. Хоць гатовы на любую: фарбаваць, касіць, рамантаваць... Пачуў параду атрымаць больш запатрабаваную на рынку працы прафесію. Тым больш што адпаведнае навучанне для зарэгістраваных у якасці беспрацоўных — бясплатнае.

Прыйшла на прыём і «прафесійная скаржніца». Прызналася, што ёй ужо адмаўляюць у далейшай перапісцы з уладай. Але ўпэўнена, што мае рацыю. Напрыклад, патрабуе, каб з вёскі, дзе жыве, часцей ездзіў аўтобус у іншую — на яе «малую Радзіму». Адказныя асобы растлумачылі, што расклад руху складзены так, каб жыхарам было зручна. І ніхто не скардзіўся. Сенатар адзначыў, што і такіх людзей трэба выслухоўваць. Бывае, сярод іншых праблем яны выказваюць тыя, якія насамрэч трэба вырашыць.

Вясковец прасіў газіфікаваць вёску. Другі заяўнік прыйшоў па дапамогу для рэгістравання гаспадарчых пабудоў...

Сенатар папрасіў дапамагчы 47-гадовай маці-адзіночцы. На прыём жанчына не прыйшла, але заяву перадала. Ёй неабходна пратэзаванне тазасцегнавога сустава. Праблема ў тым, што чарга вялікая. Аперацыю паабяцалі мінімум праз 1,5 года... Жанчыне пагражае перспектыва інваліднасці. Аляксандр Папкоў папрасіў старшыню Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміра Цярэнцьева пракантраляваць гэты зварот. Як і некаторыя іншыя.

Пасля прыёму ён падзяліўся з прадстаўнікамі СМІ сваімі ўражаннямі.

У асноўным агучаныя пытанні знаходзяцца ў кампетэнцыі не рэспубліканскага ўзроўню, а мясцовага. Аляксандр Папкоў адзначыў вялікі прафесіяналізм адказных асоб раёна і абласной вертыкалі Віцебшчыны ў вырашэнні праблем... І нагадаў пра неабходнасць індывідуальнага падыходу пры разглядзе зваротаў.

— Можна размаўляць чыста на бюракратычнай мове: накшталт, ёсць артыкул закона, ці інструкцыя так абвяшчае... Але існуюць жа яшчэ чалавечыя нормы! Яны патрабуюць адпаведнага стаўлення. Калі прыйшоў грамадзянін, які хадзіў па інстанцыях і не знайшоў паразумення, трэба падумаць, як дапамагчы. А, бывае, трэба растлумачыць, што «сігнал» не можа быць задаволены... Заяўнік павінен сысці, адчуваючы, што да яго пастараліся аднесціся па-чалавечы, — канстатаваў сенатар.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

ПАБРАЦІМЫ

ПАРТНЁРСТВА «ПА-СЯМЕЙНАМУ»

Развіццё міжрэгіянальных сувязяў — адзін з прыярытэтаў работы Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў і выканаўчага камітэта. Больш за 84,5% экспарту ўсёй прадукцыі горада пастаўляецца на рынак Расіі. Сёння Магілёў мае 18 гарадоў-пабрацімаў, у тым ліку 5 — у Расійскай Федэрацыі, і 25 гарадоў-партнёраў. Старшыня Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў Сяргей ІВАНОЎ расказаў, чым карысныя такія сувязі.

— Стасункі гарадоў-пабрацімаў дазваляюць дзяліцца вопытам у кіраванні і развіцці, садзейнічаюць пашырэнню гандлёва-эканамічных сувязяў, стварэнню высокаэфектыўных і высокатэхналагічных вытворчасцяў, пашырэнню вытворчай кааперацыі. Асноўныя перспектывы, на мой погляд, звязаны з эфектыўным супрацоўніцтвам у сферы навукі і адукацыі. Сумесныя інжынерна-тэхнічныя праекты і абмен студэнтамі, напрыклад, абавязкова дадуць магчымасць павысіць прафесійную кваліфікацыю. За кошт новых ведаў, інавацый і новых тэхналогій з'явяцца новыя вытворчасці і рабочыя месцы, павялічыцца тавараабарот, будзе паспяхова ажыццяўляцца мадэрнізацыя прамысловасці. Пацвярджэннем таму можна лічыць супрацоўніцтва Омска і Магілёва і будаўніцтва сучаснага высокатэхналагічнага прадпрыемства «Омск Карбон Магілёў» на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны «Магілёў» з аб'ёмам інвестыцый больш за $175,3 млн і стварэннем 448 новых рабочых месцаў (па стане на 1 студзеня — асвоена $26,7 млн і створана 102 рабочыя месцы).

— Па якіх яшчэ кірунках вы маглі б развіваць партнёрства паміж гарадамі?

— Супрацоўніцтва «на месцах» ахоплівае ўсе сферы жыццядзейнасці гарадоў. Ужо шмат што зроблена, але разам з тым ёсць значны патэнцыял. Мы былі б рады развіццю адносін у галіне будаўніцтва, вывучэнню сістэм энерга- і цеплазберажэння, удасканаленню транспартнай сістэмы, абмену інавацыйнымі высокатэхналагічнымі праектамі, удасканаленню сістэмы аховы здароўя, гарадскога планавання і г.д.

— Як вы ацэньваеце ўзровень пабрацімскіх сувязяў Магілёў—Пенза?

— Гарады з'яўляюцца пабрацімамі ўжо на працягу васьмі гадоў. Штогод адбываецца абмен дэлегацыямі на свята горада. За гэты час неаднойчы нашы творчыя калектывы ўдзельнічалі ў гарадскіх святкаваннях і ездзілі ў госці адзін да аднаго. Што ні год у Міжнародным юнацкім турніры гарадоў-пабрацімаў па баскетболе «Інтэрбаскет» каманда Пензы займае даволі высокія месцы. Навучэнцы сярэдніх школ удзельнічаюць у творчых конкурсах і алімпіядах. Так, летась вучні сярэдняй школы №15 г. Магілёва змагаліся за перамогу ў Міжнародным конкурсе ў Пензе «Мая любімая кніга».

— А што ў іншых сферах?

— У жыллёва-камунальнай гаспадарцы практычна штогод спецыялісты абменьваюцца вопытам па пытаннях прымянення перадавых тэхналогій. Вынікам супрацоўніцтва стала добраўпарадкаванне ў 2013 годзе Магілёўскага падворка ў Пензе.

Дзякуючы пабрацімскаму супрацоўніцтву больш цесныя формы ўзаемадзеяння з'явіліся і ў нашых прадпрыемстваў. Пашыраюцца гандлёва-эканамічныя адносіны. Так, «Магілёўліфтмаш» за 2016 год паставіў у Пензенскую вобласць 117 ліфтаў на $1,06 млн. Навукова-вытворчае інавацыйнае прадпрыемства «Тэхналіт» паспяхова супрацоўнічае з «Пензадызельмашам».

Знешнегандлёвы абарот Магілёва з Пензенскай вобласцю за 2016 год склаў $1,5 млн. Ён прадстаўлены ў асноўным нашым экспартам. $1,4 млн — гэта ліфты, трубы, нятканыя матэрыялы, помпы, электрарухавікі і мяса-малочная прадукцыя, якія пастаўляюцца з Магілёва.

— Якія мерапрыемствы пройдуць у Магілёве пры супрацоўніцтве з Пензай?

— Гэты год значны для нашага горада: мы святкуем 750-годдзе з дня заснавання. Мы чакаем прадстаўнікоў Пензы на Міжнародны пленэр па скульптуры ў камені «Каменная Казка» і Міжнародны пленэр па жывапісе. На працягу чэрвеня яны змогуць стварыць свае шэдэўры, якія, я ўпэўнены, зойміць годнае месца ў алеі гарадоў-пабрацімаў і ў выставачных залах Магілёва. Мы будзем рады бачыць патэнцыйных інвестараў і дзелавыя колы Пензы на Магілёўскім бізнес-форуме «Прыдняпроўе». Чакаем мы і харавы калектыў на Міжнародны фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа».

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

«Радуюся, калі ўдаецца дапамагчы...»

Галіну Мельнікаву на Жлобіншчыне ведаюць практычна ўсе. Яна як феерверк: там, дзе з'яўляецца, узнікаюць новыя ідэі, адбываецца свята і вырашаюцца многія пытанні

Галоўны рэдактар раённай газеты «Новы дзень» летась была сярод пераможцаў VIII Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2015». У шостым скліканні яна абрана членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны. Каб з ёй сустрэцца, людзі неабавязкова запісваюцца да яе на прыём. Часта проста падыходзяць, калі яна ідзе па вуліцы. Спыняюць, звяртаюцца, скардзяцца, дзеляцца болем і радасцю...

Тым часам сама Галіна лічыць, што з дапамогай важна дайсці да самых сціплых, хто сам саромеецца звяртацца да ўлад. Мельнікава з'яўляецца яшчэ дэпутатам раённага і абласнога ўзроўняў, таму сучасныя праблемы людзей ведае дасканала. Кажа, гэтаму спрыяе і асноўная прафесійная пасада.

— Работа з людзьмі даўно стала маім ладам жыцця. Я чалавек каманды. Для мяне ва ўзаемадзеянні заўсёды галоўнае, што мне аказалі давер. Да таго ж хутка будзе 20 гадоў, як узначальваю раённую арганізацыю Беларускага саюза жанчын. Я, відаць, нарадзілася лідарам. У школе была старшынёй савета піянерскай дружыны, а потым сакратаром камітэта камсамола. І так заўсёды. Хаця самой здаецца, што наўмысна да гэтага не імкнулася, але працаваць з людзьмі падабалася.

— Галіна Уладзіміраўна, многія задаюцца пытаннем: а навошта ёй гэта ўсё патрэбна?

— Я таксама часта задаю сабе гэтае пытанне, асабліва калі моцна стамляюся. Часам здаецца, што сіл увогуле ўжо няма. Але потым я аказваюся ў колазвароце жыцця і мяне зноў зацягвае. Людзі прыходзяць, расказваюць пра свае праблемы, і ў мяне няма сіл ім адмовіць. Радуюся, калі ўдаецца дапамагчы. Магчыма, гэта важна для ўнутранага самаадчування і развіцця. Відавочна: калі ты дапамагаеш, нешта аддаеш, ты ў шмат разоў больш сам атрымліваеш. Жывеш больш асэнсавана. Калі бачыш розныя праблемы людзей, больш аб'ектыўна ацэньваеш і сябе. Урэшце, шануеш тое, што табе Богам дадзена. І нават тыя выпрабаванні, якія праходзіш. А ў маім асабістым жыцці іх было нямала.

— Ведаю, што вы 17 гадоў таму пахавалі старэйшую дачку...

— Так, таму паступова сыходзяць нейкія занадта амбіцыйныя планы і ты даражыш тым, што ў цябе ёсць сёння. І гэта — самае каштоўнае ў маім жыцці і рабоце. У лёсе ўсё не выпадкова. Відаць, так хоча Бог — каб я клапацілася пра іншых людзей. Можа, ён хоча мяне загартаваць ці адвесці ад нейкіх іншых выпрабаванняў...

— Звычайна той, хто праз нешта прайшоў і перажыў, зусім па-іншаму глядзіць на свет і яго спакусы...

— Я нарадзілася на хутары — у пасёлку Эрд, тут, на Жлобіншчыне. І тады там было ўсяго 15 дамоў, а цяпер засталося толькі тры. У маёй вёсцы ніколі не было ні школы, ні крамы, ні тым больш садка. У школу хадзіла ў Шчэдрын пешшу за тры кіламетры. Нас было чацвёра дзяцей у сям'і, я самая малодшая. Бацькі не стала, калі вучылася ў сёмым класе. Маці нас падымала адна. Так здарылася, што цяпер я вакол сябе аб'ядноўваю ўсіх сваякоў.

> Часам здаецца, што сіл увогуле ўжо няма. Але потым я аказваюся ў колазвароце жыцця і мяне зноў зацягвае.

— Галіна Уладзіміраўна, ёсць праблемы, якія вы назвалі характэрнымі для нашага часу?

— Відаць, пытанні працаўладкавання. Нядаўна прыходзіла жанчына, якую скарацілі на прадпрыемстве, а ў яе пенсія праз некалькі гадоў. У яе ёсць працоўны стаж для налічэння пенсіі, яна згодная працаваць і цяпер, але ж па сваёй адукацыі ўладкавацца нідзе не можа. Яе тут жа запісалі ва ўтрыманцы. Вядома, крыўдна. У Дэкрэт «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» ў пачатку года своечасова ўнесены пэўныя змяненні. Магчыма, з часам спатрэбіцца далейшае яго ўдасканаленне. Некалькі раней мы ў рэдакцыі правялі круглы стол па рэалізацыі Дэкрэта № 3 на тэрыторыі Жлобінскага раёна — з удзелам усіх адпаведных спецыялістаў. Магчыма, часткова папярэдзілі некаторыя праблемы, з якімі людзі сёння так востра сутыкаюцца. Увогуле ж, многія пытанні нельга адразу вырашыць з-за недахопу фінансавых сродкаў. Але ж, калі сёння яны

не вырашаюцца, гэта адбудзецца праз пэўны час. Да таго ж трэба пастаянна ўдасканальваць заканадаўчыя акты.

— Бываюць моманты, калі не ведаеце, як дапамагчы, бо вычарпаны ўсе заканадаўчыя магчымасці?

— Безумоўна, у такім выпадку застаецца спачуваць людзям. Хоць такіх пытанняў мала. Здараецца, што асобныя людзі прыходзяць і ўскладаюць усе свае спадзяванні выключна на дзяржаву. Мяне напружвае тэндэнцыя да ўтрыманства. Часам прыходзіцца далікатна, але паставіць на месца. Прыватныя пытанні бываюць самыя розныя. У тым ліку яны датычацца наладжвання стасункаў з суседзямі, дзецьмі ці бацькамі. На жаль, сціплыя людзі, якім сапраўды патрэбна дапамога, самі не прыйдуць на прыём да дэпутата — яны саромеюцца звяртацца да ўлад.

— А ці прыходзяць з прапановамі грамадскай значнасці?

— Так, здараецца, нейкае асабістае пытанне перарастае ў падставу для калектыўнага абмеркавання. Пасля апошняга прыёму ўзніклі, напрыклад, прапановы ў Крымінальны кодэкс. Паколькі я член камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, будзем абмяркоўваць іх. Дарэчы, у зону маёй адказнасці ўваходзяць Жлобінскі, Светлагорскі і Буда-Кашалёўскі раёны. Ва ўсіх я правяла ўжо прыёмы грамадзян, пайшла па другім крузе. Да таго ж актыўна сустракаюся з людзьмі ў калектывах.

— Галіна Уладзіміраўна, вас жа не выпадкова ўзнагародзілі летась на рэспубліканскім конкурсе «Жанчына года — 2015». Была адзначана ваша актыўная дзейнасць на грамадскай пасадзе старшыні Жлобінскай раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын...

— За 20 гадоў многія з нашых ініцыятыў былі падтрыманы ўладамі. Рэалізавана шмат разнастайных праектаў, і некаторыя атрымалі развіццё ў Жлобінскім раёне. У нас ёсць цікавы праект з дзяўчаткамі-падлеткамі: «Чацвер шчырай размовы». Мы з актывісткамі жаночага руху сустракаемся са старшакласніцамі — ужо аб'ехалі палову раёна. На асабістых прыкладах расказваем, якім чынам у нашай краіне можна паспяхова рэалізавацца. Разам з тым падказваем дзяўчаткам, як пераадольваць нейкія негатыўныя жыццёвыя сітуацыі. У сям'і дзеці не заўсёды знаходзяць адказы на хвалюючыя пытанні. Так здараецца, што пасля нашых гутарак хтосьці хоча пагаварыць прыватна. Пытаюць пра рознае: як вы выхоўвалі сваю дачку, як складаюцца адносіны з мужам. Тэм закрытых у нас няма. Між тым не ўтойваю, што сама была не вельмі дысцыплінаваная вучаніца. Я добра вучылася, але была «рэактыўная». Таму расказваю пра тое, як энергію накіраваць у мірнае рэчышча. Яшчэ мы разам — рэдакцыя газеты і жаночая арганізацыя — праводзім акцыю «Сям'я — усяму пачатак». У яе межах ушаноўваем найлепшыя сем'і па сельсаветах. Зусім нядаўна наведалі сям'ю, у якой нарадзілася адразу тры дзіцяці. Бацькі звярнуліся да мяне з пытаннем паляпшэння жыллёвых умоў. Цяпер разважаю, як ім найхутчэй дапамагчы.

— Пры такой актыўнай дзейнасці ці шмат часу застаецца для асабістага жыцця?

— Мне бывае вельмі складана. Але ж я дабілася галоўнага: камфортна сябе адчуваю і дома, і на рабоце, і на сваёй дачы. Самае важнае — акружыць сябе такімі людзьмі, з кім утульна. Я вельмі прывязана да сваіх каранёў. З мужам Валянцінам мы выконваем апошні матчын загад. Маці заўсёды прасіла: дачка, не кідай наш дом. І цяпер уся сям'я з задавальненнем адпачывае ў куточку, дзе я нарадзілася. Мне час ад часу хочацца адпачыць ад публічнасці. У той жа час я не люблю сумнае жыццё — люблю жыць і працаваць прыгожа. Нават калі я гатую нешта — павінна атрымацца вельмі смачна і прыгожа.

— А што вы такое смачнае гатуеце?

— Люблю гатаваць традыцыйную беларускую ежу, імкнуся, каб яна атрымлівалася так смачна, як у матулі. Мая дачка Настасся выйшла замуж за расіяніна. І цяпер мой зяць вельмі любіць есці тое, што мной прыгатавана. Ён кажа, што я частую шкоднай, але вельмі смачнай ежай. Тут і дранікі, і калдуны, і бабка, язык з грыбамі, расольнік, боршч... Праўда, не люблю гэта рабіць штодзень. Але калі бяруся, то раблю з душою.

— Была вельмі здзіўлена, калі даведалася, што ваша рэдакцыя спансіруе асобныя бюджэтныя структуры...

— Мы не толькі расказваем пра жыццё ў раёне, але і дапамагаем вырашаць праблемы людзей і знаходзім для гэтай мэты сродкі. Два гады запар дзесці па паўмільярда ў старых грошах мы выдаткоўвалі на дабрачыннасць. Гэтыя сродкі пайшлі на мэблю для бальніцы, на рамонт дахаў, на касцюмы для двух народных калектываў. Са сваіх прыбыткаў дарылі залатым медалістам раёна ноўтбукі. Пазалетась падарылі 17, летась — 31. У мінулым годзе за свае сродкі выпусцілі альманах «Жлобіншчына літаратурная», дзе сабралі літаратурную творчасць нашых землякоў за 85 гадоў існавання газеты. Нашы супрацоўнікі маюць добры заробак, сацыяльны пакет і працуюць у годных умовах.

— У вас ёсць ідэі, якія вы яшчэ хацелі б увасобіць у жыццё?

— Мой сённяшні сенатарскі статус — гэта сур'ёзная нагрузка. У першую чаргу ў сэнсе патрабаванняў да сябе. Ёсць планы і маштабныя праекты, якія мне хочацца рэалізаваць. Сёлета мы паспрабуем стварыць дабрачынны жаночы клуб «Адкрытыя сэрцы». А калі пра асабістае... Наш вялікі бацькоўскі дом быў заўсёды поўны сваякоў. Думаю, прыйдзе час, я буду больш свабодная, тады на нашай малой радзіме будуць часцей збірацца ўсе мае родныя людзі: дачка з зяцем, унучка Васіліса, брат і сястра з пляменнікамі. Калісьці прачытала такое выказванне: нават там, дзе няма людзей, старайся заставацца чалавекам. Відаць, у жыцці гэта самае важнае.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

Не менш за 15 «квадратаў» на чалавека

У рэдакцыю паскардзілася Марыя Пухто з вёскі Пласток Любанскага раёна. Марыя Філіпаўна расказала, што яны з мужам 4 гады таму забралі да сябе 89-гадовага сваяка, ахвяру фашысцкіх канцлагераў. «Хацелі зарэгістраваць яго па месцы свайго жыхарства, але мясцовыя ўлады адмовілі, паколькі для гэтага не хапае 2,4 квадратнага метра плошчы. Сказалі, што можам прарэзаць дзверы ў летнюю прыбудоўку для павелічэння метражу. І тады дзядулю змогуць зарэгістраваць. У выніку мы яго зарэгістравалі ў суседзяў. Чаму мясцовыя ўлады не пайшлі нам насустрач у парадку выключэння? Ці маюць яны рацыю з пункту гледжання заканадаўства?» — цікавіцца наша чытачка.

Адказаць на пытанне мы папрасілі адваката спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі №3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Святлану Касцевіч.

Спецыяліст растлумачыла, што рэгістрацыя грамадзян па месцы жыхарства ў пэўных выпадках можа абмяжоўвацца. А менавіта: у закрытых ваенных гарадках і на тэрыторыях, у зонах экалагічнага бедства. А таксама ў тых мясцінах, дзе ў сувязі з небяспекай распаўсюджання інфекцыйных захворванняў або атручэннямі ўведзены асобыя ўмовы і рэжымы. Чалавек таксама не можа быць зарэгістраваны, калі ў населеным пункце, рэгіёне дзейнічае надзвычайнае або ваеннае становішча.

Акрамя таго, рэгістрацыя па месцы жыхарства ў жылое памяшканне магчыма толькі тады, калі пасля гэтага забяспечанасць агульнай плошчай у ім складзе не менш за 15 квадратных метраў на аднаго чалавека, у інтэрнаце — не менш за 6 «квадратаў».

Такім чынам, у выпадку парушэння ўказаных нормаў заяўніку могуць адмовіць у рэгістрацыі сваяка па месцы жыхарства. Разам з тым адмова павінна быць матываваная. Аб гэтым заяўнік інфармуецца пісьмова на працягу трох рабочых дзён з дня прыняцця рашэння.

Акрамя таго, адмоўны адказ, іншыя дзеянні ці бяздзеянні службовых асоб органа рэгістрацыі могуць быць абскарджаны ў вышэйшыя дзяржаўныя інстанцыі або ў суд.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

«ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ» СТРАТЭГІЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ адзначыў, што дзяржава прыкладае вялікія намаганні для вяртання пацярпелых тэрыторый да жыцця і росту сацыяльна-эканамічнага дабрабыту. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што беларускімі навукоўцамі для пераадолення наступстваў катастрофы на ЧАЭС, а таксама для ўстойлівага развіцця пацярпелых тэрыторый распрацавана шмат прапаноў.

Леанід МАРЫНІЧ, першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь:

— Меры, якія прымаліся на працягу апошніх гадоў, прывялі да таго, што сёння практычна няма паступлення радыенуклідаў у сельскагаспадарчую малочную і мясную прадукцыю, якая трапляе на перапрацоўку. Праз 30 гадоў пасля аварыі на ЧАЭС асноўная колькасць радыенуклідаў цэзія-137 і стронцыя-90 знаходзіцца ў тым пласце глебы, дзе карані раслін. Не выключана магчымасць таго, што небяспечныя рэчывы трапяць у расліны, а значыць, у корм жывёл і ўрэшце на стол чалавека. На пераход радыенуклідаў у прадукцыю раслінаводства значна ўплывае шчыльнасць забруджвання глебы і тыя мерапрыемствы, якія мы праводзім. Сёлета ў межах праграм з бюджэту выдзелены і размеркаваны 63,8 млн рублёў. З іх 41 млн рублёў — на набыццё фосфару і 22,8 млн — на набыццё калію. Вапнаванне кіслых глеб, унясенне павышаных доз мінеральных угнаенняў, падбор культур і сартоў з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі з комплексу засцерагальных мер, якія прымяняюцца ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Выклікае заклапочанасць зніжэнне ўтрымання гумусу ў ворных глебах на забруджаных тэрыторыях, куды практычна не ўносяцца арганічныя ўгнаенні. Гэтую работу трэба праводзіць.

роўлі. На сяле пабудавана восем малочнатаварных фермаў, рэканструявана — 33. Пры наяўнасці чарнобыльскіх субвенцый пабудаваны і рэканструяваны свінафермы ў Ельскім, Лельчыцкім, Нараўлянскім, Чачэрскім раёнах. У Лоеве пабудавана самая сучасная бальніца. Праведзена рэканструкцыя паліклінічнага корпуса Гомельскага абласнога анкалагічнага дыспансера... Усе «чарнобыльскія» раёны атрымліваюць значную падтрымку ў аздараўленні дзяцей у розных санаторыях, у тым ліку за мяжой. Але ж сёння асноўная праблема, з якой мы сутыкнуліся, — стварэнне новых працоўных месцаў.

Галоўны урач РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека Аляксандр РАЖКО дэманструе магчымасці сучаснай лабараторыі.

Марыя ГЕРМЯНЧУК, начальнік Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь:

— Радыяцыйны маніторынг дазваляе не толькі атрымліваць ацэнку сітуацыі, але і яе прагназаваць. На сённяшні дзень адназначна можна сказаць, што існуе дастатковая навуковая нарматыўна-прававая база для фарміравання далейшай стратэгіі. Сёння для нас важна зразумець, што мы ўжо выйшлі з сітуацыі аварыйнага выпраменьвання, у якой жылі на працягу папярэдніх 30 гадоў, пакуль не адбыўся паўраспад цэзію-137. Мы стаім перад неабходнасцю зрабіць навукова-метадычнае інфармацыйнае абгрунтаванне пераходу ад сітуацыі аварыйнага выпраменьвання да становішча існуючага выпраменьвання. У ім мы будзем працягваць жыць наступныя дзесяцігоддзі. Сёння ўжо трэба казаць не пра «зоны», а пра іншую класіфікацыю тэрыторый. Гэты пераход павінен быць добра прапрацаваны на інфармацыйным узроўні. І ў прыняцці такога рашэння павінны браць удзел жыхары забруджаных тэрыторый, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады.

Валерый ШАЎЧУК, намеснік міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь:

— Сёння трэба адысці ад радыяцыйнай рэабілітацыі і прыйсці да рэабілітацыі эканамічнай. Я лічу, што «чарнобыльскія» грошы на абласным узроўні размываюцца. Трэба дабівацца, каб яны мэтанакіравана ішлі на забруджаныя тэрыторыі. Што тычыцца праблем на гэтых землях, сярод іх у тым ліку выкарыстоўванне забруджанай драўніны на паліва — 80% радыеактыўнасці, асабліва ў хваёвай драўніне, утрымліваецца ў кары. Найбольш небяспечным прадуктам для вяскоўцаў былі і застаюцца дары лясоў. Народ як хадзіў у лес, так і будзе хадзіць. Контрмера — толькі тлумачальная работа. Ёсць яшчэ адна важная тэма. Прапаную ў Гомелі стварыць музей, прысвечаны вялікай трагедыі XX стагоддзя. Няхай ён нагадвае пра тых людзей, якія фарміравалі дзяржаўную палітыку ў першыя постчарнобыльскія гады: Аляксандра Грахоўскага, Мікалая Вайцянкова, Івана Кеніка, Марыю Худую...

Мікалай ЦЫБУЛЬКА, намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь:

— Закон «Аб рэжыме тэрыторый, якія падверглісяradыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» вызначае заніраванасць тэрыторый радыеактыўнага забруджвання і аднясення населеных пунктаў да тых ці іншых зон. У нас за пасляаварыйны перыяд колькасць іх знізілася: з 3678 да 2193. Лічу, што паступова трэба сыходзіць ад паняцця «заніраванне тэрыторый». У нас ёсць зоны адчужэння, першачарговага, наступнага адсялення. Адсяленне людзей мы завяршылі яшчэ ў 2007 годзе. Нам трэба вызначыць іншыя паняцці, бо сённяшнія выклікаюць зашмат пытанняў у людзей. Наступны блок пытанняў датычыцца вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці. Адразу пасля аварыі ў нас было забруджана 1 млн 840 га земляў. Цяпер у абароце знаходзіцца больш за 900 тысяч га. Для атрымання нарматыўна чыстай прадукцыі праводзіцца комплекс ахоўных мерапрыемстваў. Асноўныя тыя, якія звязаны з павышэннем урадлівасці глебы: вапнаванне, прымяненне фосфарных і калійных угнаенняў. Гэта тое, што блакіруе паступленне цэзію і стронцыю па харчовым ланцугу: расліна — жывёла. Але ж у апошнія гады змяненне заканадаўства па закупках прывяло да таго, што мы маем нерытмічныя пастаўкі ўгнаенняў, а значыць, і іх нясвоечасовае ўнясенне ў глебу. У лясной гаспадарцы на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання ёсць праблема з выкананнем супрацьпажарных мер. Там вядуцца санітарныя доглядныя работы ў лясным фондзе, але сродкаў не хапае, каб у поўным аб'ёме забяспечыць нармальны стан пад'язных шляхоў да вадаёмаў, дзе можна праводзіць забор вады. У Палескім запаведніку ў 2015 годзе адбыўся вялікі пажар. Пакуль не вырашана, што рабіць з гарэльнікам: зразаць і штабеляваць ці пакідаць як ёсць? Сёння вучоным дадзена заданне пралічыць, што рабіць у гэтай сітуацыі.

— На жаль, яны выкарыстоўваюцца ў рабоце не ў поўную сілу. Галоўная задача нашай камісіі — маніторынг выканання існуючага заканадаўства на пацярпелых у выніку аварыі тэрыторыях. Пасля вывучэння і абагульнення агучаных рэкамендацый на іх аснове, калі гэта неабходна, будзе выпрацавана абноўленая стратэгія дзеянняў. Вядома, што за 30 гадоў адбылося шмат змен, якія патрабуюць карэкціроўкі законаў. Сёння, калі ўжо зроблены крок ад пытанняў ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай бяды да пытанняў выкарыстання забруджаных тэрыторый і інтэнсіўнага іх развіцця, вельмі важна забяспечыць нармальнае пражыванне там людзей і выбудаваць правільную сацыяльную палітыку.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Алег БАРЫСЕНКА нагадаў, што менавіта Гомельшчына больш за іншыя рэгіёны пацярпела ад наступстваў Чарнобыля. Але ж ён прывёў і станоўчыя прыклады адраджэння гэтых земляў:

— Скажу толькі пра самыя буйныя з увасобленых у жыццё праектаў. За апошнія гады ў нас створана вытворчасць сухой малочнай сыроваткі на прадпрыемстве «Палескія сыры» ў Хойніцкім раёне. Адбылася мадэрнізацыя і тэхнічнае пераўзбраенне завода жалезабетонных вырабаў у Хойніках. Мадэрнізаваны шчэбеневы завод у Глушкавічах Лельчыцкага раёна. Комплексна пераўзброена прадпрыемства «Чырвоны Мазыранін» у На-

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Алег ЯДРЫНЦАЎ на працягу некалькіх гадоў узначальвае Гомельскую гарадскую клінічную бальніцу №1. Ён падкрэсліў, што вынікам рэалізацыі папярэдніх Дзяржаўных праграм па пераадоленню наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС стаў пераход ад мінімізацыі, рэабілітацыі чарнобыльскіх праблем да ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Пры гэтым як медык заклікаў не закрываць вочы на бяспеку людзей:

— У Гомельскай вобласці 1 180 000 чалавек стаіць на спецдыспансерным уліку. Гэта значная частка насельніцтва. Нам сёння трэба клапаціцца пра бяспечнае пражыванне людзей на забруджаных тэрыторыях. Гэта не так проста, бо чалавек карыстаецца дарамі лесу — як бы яму гэта не забаранялі. Працягваць актыўна растлумачваць наступствы — задача не толькі выканаўчай улады, але і сістэмы аховы здароўя, і нас, дэпутатаў. 4,5% ад тых дроў, якія выкарыстоўвае насельніцтва для ацяплення, з'яўляюцца радыеактыўна забруджанымі. Попел, які пасля іх застаецца, — гэта ж радыеактыўныя адходы. Яго дбайны гаспадар выкідае ў агарод. Якую прадукцыю ён у такім выпадку вырошчвае на сваім прысядзібным участку? Каб мінімізаваць уздзеянне гэтых адходаў пры ацяпленні, патрэбна ўжыванне альтэрнатыўных відаў паліва. Што датычыцца кадраў, якія трэба замацоўваць у гэтых раёнах, прапаную ўспомніць непапулярную меру — павелічэнне тэрміну адпрацоўкі выпускнікоў пасля заканчэння вучэбных устаноў хоць бы да трох гадоў.

— Магчыма, аздараўленчая палітыка, якую мы сёння праводзім, ужо не ў поўнай меры адпавядае сучасным патрабаванням, — адзначыў Аляксандр Папкоў. — Разам з навукоўцамі і медыкамі мы сёння павінны правесці маніторынг гэтых пытанняў і абмеркаваць, у якім кірунку рухацца і што трэба яшчэ зрабіць. Таму даводзіцца казаць не толькі пра перараспецыялізацыю сельскай і лясной гаспадарак, але і пра ўменне людзей жыць ва ўмовах малых доз радыяцыі, прафілактычную работу сярод насельніцтва, яго здароўе і іншае. Пры неабходнасці будзем уносіць адпаведныя змены ў заканадаўства.

Ірына ПРУДНІКАВА, старшыня Крычаўскага раённага Савета дэпутатаў:

— Сёння ў нашым раёне пражывае менш за 10 тысяч чалавек. Калі раней мы казалі пра праблемы з кадрамі, сёння гэта пытанне неактуальнае. Вось пытанне, якое мы не змаглі вырашыць. У нас у зоне адсялення знаходзіцца 48 грамадзянскіх могілак. Да Радаўніцы мы праводзім там санітарную ўборку. За кошт «чарнобыльскіх» грошай 5—6 могілак у зоне добраўпарадкоўваюцца. А на астатніх няма магчымасці праводзіць нейкія работы. Пры гэтым час ад часу там адбываюцца аварыйныя сітуацыі — напрыклад, у вёсцы Малы Осаў упала дрэва. Каб ліквідаваць аварыю — грошай не прадугледжана. Магчыма, некаторую частку сродкаў, якія выдзяляюцца, трэба накіроўваць на фінансаванне аварыйных работ.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

Другое прышэсце

Чаму людзі вяртаюцца ў вёску?

Спрадвеку гэта вёска знаходзілася ў месцы, дзе нярэдкімі гасцямі былі падарожнікі або гандляры. Адсюль і назва Гудзевічы, бо народ тут увесь час гудзе. Сёння аграгарадок з такой назвай знаходзіцца паміж Гроднам і Ваўкавыскам. Здавалася б, моладзь непазбежна павінна кіравацца ў гарады — па працу і статус, але вёска не меншае. Наадварот, штогод тут з'яўляюцца новыя дамы.

Вяртанне да родных ніў

Усяго Гудзевіцкі сельсавет налічвае 17 населеных пунктаў. Вёскі Пілкі, Радзявічы даволі вялікія, але не ідуць у параўнанне з аграгарадком Гудзевічы, дзе сёння жыве 734 чалавекі — больш за палову ўсяго насельніцтва сельсавета.

У самім аграгарадку ёсць адзінае прадпрыемства ЗАА «Гудзевічы», што спецыялізуецца на сельскай гаспадарцы. Туды ж працаўладкоўваецца абсалютная большасць прыезджых. Іншыя шукаюць работу ў навакольных вёсках, і толькі адзінкі выпраўляюцца на працу ў раённы цэнтр Масты, што знаходзіцца за 30 кіламетраў ад сельсавета.

— У асноўным у нас замацоўваюцца спецыялісты, — расказвае **Пётр ДЗЕНІСЕВІЧ, старшыня Гудзевіцкага сельскага Савета дэпутатаў.** — Гэта і моладзь, якая атрымала размеркаванне пасля вучобы, а потым засталася на пастаянnае месца працы, і больш вопытныя работнікі, якія адпрацавалі пэўны тэрмін у іншым месцы, а потым вярнуліся на радзіму. Таксама шмат людзей прыязджаюць сюды пасля выхаду на пенсію. Такіх цягне ў родную вёску, да бацькоўскай хаты. Яны з ахвотай займаюцца сельскай гаспадаркай, ладзяць агароды, гадуюць на падворках свойскую жывёлу. Вядома, ёсць яшчэ і сезонныя жыхары, дачнікі.

Наогул жыллё, на думку старшыні, — асноўны спосаб прыцягнуць моладзь у аграгарадок. Канешне, абласны цэнтр спакушае магчымасцямі, але кватэру атрымаць там складана. А ў Гудзевічах маладыя спецыяліст адразу пераязджае на выдзеленыя ад прадпрыемства квадратныя метры. Можна ўладкавацца ў аднапавярховым катэджыку (пасёлак штогод «прырастае» на тры-чатыры падобныя будынкі), можна пасяліцца ў кватэры гарадскога тыпу. У хуткім часе ў аграгарадку якраз павінен з'явіцца трохпавярховы дом на 12 кватэр. Звычайна работнікі, якія даўно прыехалі ў вёску, выкупляюць часовы прытулак у прыватную ўласнасць. Старшыню сельскага Савета гэта радуе: значыць, чалавек стала замацоўваецца на месцы.

Фота Надзеі БУЖАН.

Новы дзіцячы садок у Гудзевічах.

Аўтобус для першакласніка

Для жыхароў суседніх вёсак паездка ў Гудзевічы можа стаць альтэрнатывай падарожжу ў райцэнтр. У аграгарадку ёсць крамы, дом культуры, кафэ-бар, лазня. Медыцынскую дапамогу жыхарам аказваюць у амбулаторыі.

Асаблівае месца ў тутэйшай інфраструктуры займае дзіцячы садок. Напачатку ён размяшчаўся ў прыстасаваным будынку — былой панскай сядзібе. Умовы там былі не самыя спрыяльныя, а новую ўстанову для дашкольнікаў будавалі доўга, работа ўвесь час прыпынялася.

— Аднойчы ў Мастах праходзіла акцыя, калі можна было задаць пытанне губернатару. Я пацікавілася, ці быць у нашай вёсцы дзіцячаму садку, — і праз месяц будоўля аднавілася. А ў канцы чэрвеня 2012 года мы ўжо святкавалі наваселле, — расказвае **Таццяна КАЛЫХАН, загадчыца Гудзевіцкага дзіцячага садка.**

Будынак стаў сапраўдным падарункам мясцовым жыхарам. Разлічаны ён на 78 месцаў. Абсталяваны сучаснай мэбляй, ёсць уласная пральня, харчблок, музычная і спартыўная залы, асобныя кабінеты для педагога-псіхолага і педагога-дэфектолага. У пакоі для тэхнічнага персаналу работнікі могуць адпачыць, паабедаць. Тут жа, пад адным дахам, знаходзіцца медпункт з ізалятарам для хворых малых.

Па словах Таццяны Калыхан, штогод у садзік ідзе прыблізна адна і тая ж колькасць выхаванцаў — 37—38 дзяцей. А налета плануецца папаўненне да 45 чалавек. Такі «прырост», на думку загадчыцы, выкліканы сем'ямі, што прыехалі ў вёску на пастаяннае месца жыхарства. Многія з іх становяцца шматдзетнымі.

Недалёка ад дзіцячага садка знаходзіцца яшчэ адна ўстанова адукацыі. У Гудзевіцкай сярэдняй школе Таццяна Ніканава працуе чатыры гады. Пра тое, што застануцца ў вёсцы, з будучым мужам вырашылі яшчэ да вяселля. Цяпер яна — сацыяльны педагог і адначасова настаўнік матэматыкі, а муж Генадзь — галоўны аграном на прадпрыемстве.

Марына і Іван ЛУКА засталіся ў вёсцы і не шкадуюць.

Цуд усяго раёна

У 1968 годзе настаўнік беларускай мовы і літаратуры Алесь Белакоз разам з вучнямі адкрыў школьны музей. Экспанаты траплялі туды рознымі шляхамі і былі рознага кшталту: ад прадметаў традыцыйнага побыту да асабістых рэчаў знакамітых беларускіх пісьменнікаў.

— У 1990 годзе музей набыў статус дзяржаўнага, а ў 2012-м тут было ўжо 13 экспазіцыйных залаў і этнаграфічны аддзел «хатка», — вядзе экскурсію **дырэктар музея Кацярына БАСІНСКАЯ.** — Захоўваем як адметныя для нашай мясцовасці экспанаты, так і прадметы, што будуць цікавыя наведвальніку з любога куточка краіны. Напрыклад, ліст роднага брата Якуба Коласа. Або экспазіцыя, прысвечаная Ларысе Геніюш, з асабістымі рэчамі паэтэсы.

За мінулы год у музеі пабывала каля 8 тысяч чалавек. Арганізатары разумеюць, што кожная турыстычная група хоча пабачыць як мага болей, і прыязджаць толькі ў Гудзевічы — для падарожнікаў не самы выгадны варыянт. Затое прыпынак у Мастоўскім раёне можа стацца цікавым для груп, што едуць па вялікім маршруце ў Ваўкавыск ці Гродна... А для гэтага неабходна прадставіць гатовы турыстычны «прадукт».

— Трэба, каб людзі тут маглі адпачыць, перакусіць, і каб усё было ў крокавай даступнасці. Аднак змены патрабуюць сродкаў. Пакуль жа мы можам прапанаваць ім толькі мясцовыя крамы, — кажа Кацярына Басінская.

— Вядома, нельга сказаць, што жыццё ў Гудзевічах зусім без праблем, — падводзіць вынікі вандроўкі па аграгарадку Пётр Дзенісевіч. — Так, вуліца Азёрная да гэтага часу не заасфальтавана. Насельніцтва летам скардзіцца на пыл, але прывесці дарогу ў парадак у сельвыканкама не стае сродкаў. Трэба чакаць дапамогі ад іншых інстанцый. Яшчэ пытанні выклікае якасць вады. Каб вырашыць праблему, ужо запланавана будаўніцтва станцыі абезжалезвання. Будзем чакаць, што з гэтага атрымаецца. Наогул жа лічу, што вёска як была перспектыўнай, так і застанецца. Чаму? Таму што тут імкнуцца ствараць камфортнае жыццё.

З гэтым цяжка не пагадзіцца. Людзям ёсць дзе жыць, ёсць дзе працаваць, ёсць куды схадзіць... А галоўнае — яны адчуваюць, што іх чуюць, да іх праблем ставяцца неабыякава.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
yurgel@zviazda.by

УЛАСНЫ ПОГЛЯД

ВЫМІРАННЕ ЦІ АПТЫМІЗАЦЫЯ?

Ці варта бедаваць па тым, што знікла?

Неяк занесла мяне журналісцкая доля на чарговы круглы стол. Тэмы дакладна не памятаю, але гаворка ішла аб праблемах вёскі. І ўсе выступоўцы, нібы змовіўшыся, пачыналі стагнаць, што вёска вымірае і што трэба з гэтым нешта рабіць. Прысутныя чыноўнікі, журналісты і актывісты са спачуваннем ківалі галовамі. Маўляў, трэба. А то старыя паміраюць, моладзь з'язджае, і заўтра не будзе каму кароў падаіць ды бульбу выкапаць. І хат вунь колькі пустых стаіць. І агароды пустазеллем зарастаюць. Жудасць!

Але ж няма роду без выроду. І сярод спагадлівых людзей знайшоўся цынік, які з хаўтурнага плачу па вёсцы толькі пасмейваўся. Гэтым цынікам быў я. Удосталь наслухаўшыся «песень жальбы», я задаў прысутным адзінае пытанне: «А хто з вас гатовы кінуць сваё гарадское жыццё і заўтра адправіцца паднімаць сяло?» На колькі секундаў стала чуваць, як зумкае муха, наразаючы кругі пад столлю. Паненкі ўтаропіліся ў свае дагледжаныя пазногцікі, а мужчыны міжволі сталі папраўляць гальштукі. Аматараў заглыбіцца ў аграрамантыку сярод тых, хто бедаваў пра выміранне вёскі, не аказалася...

Давайце глядзець у вочы гістарычнай праўдзе. Жыць з сялянскага мазаля заўсёды было невыносна цяжка. Таму падаваліся вяскоўцы хто ў горад на завод, хто ў войска. Бо іншых сацыяльных ліфтаў не існавала. А калі пры «кукурузным» генсеку сялянам сталі нарэшце выдаваць пашпарты, то апусценне вёсак стала пытаннем часу. Бо ўсе мы людзі, усім хочацца камфорту. Каб вада з крана, а не са студні. І цёплая прыбіральня ў хаце, а не «шпакоўня» на сямі вятрах. І не жылы рваць за плугам, а сядзець ва ўтульнай канторы... А ў тэхнічна «прасунутым» XXI стагоддзі абязлюджванне сельскай мясцовасці пайшло яшчэ хутчэй. Паводле Белстата, у 2005 годзе ў вёсках пражывала болей за 2,7 мільёна беларусаў. А ў 2015-м вяскоўцаў засталося 2,1 мільёна. Запомнім гэтыя лічбы.

А цяпер звернемся да іншай статыстыкі. Белстат сведчыць, што вытворчасць мяса і птушкі за тыя ж дзесяць гадоў выросла з 1024 да 1662 тысяч тон. Малака — з 5676 да 7047 тысяч тон. Яек — з 3103 да 3816 мільёнаў штук. Нелагічна неяк выходзіць: вёска вымірае, а вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі расце! Хаця з пункту гледжання абывацельскай логікі мусіць быць наадварот. Дык што гэта: памылкі, прыпіскі? Не. Проста — новыя тэхналогіі.

Прагрэс робіць сваю справу. І на ферме, дзе трымаюць тысячы галоў свіней, можа быць толькі пяць работнікаў на змене. І яны спраўляюцца! Аўтаматызацыя і механізацыя, спадарства! Сучаснай сельскай гаспадарцы не патрэбна столькі працоўных рук, як яшчэ паўстагоддзя таму. Адпаведна, адпадае неабходнасць у шматлікім вясковым насельніцтве. І пераважная большасць людзей канцэнтруецца ў гарадах. Падобнае назіраецца ва ўсіх развітых краінах. І Беларусь тут, як той казаў, у трэндзе.

Многім вёскам наканавана знікнуць з аб'ектыўных эканамічных прычын. І рабіць «штучнае дыханне» бесперспектыўным населеным пунктам — дорага і немэтазгодна. Застаецца толькі забяспечваць прадугледжаныя законам сацыяльныя стандарты тым жыхарам, хто вырашыў дажываць там свой век.

А насельніцтва, занятае ў сельскай гаспадарцы, таксама хоча больш камфортных умоў пражывання. Каб не горш, чым у горадзе: камунальныя выгоды, а таксама банк, пошта, добры магазін, школа, дзіцячы сад... Так, гэта канцэпцыя аграгарадкоў, якая даўно рэалізуецца ў нашай краіне. Натуральна, узнікаюць яны не ў чыстым полі, а на базе вёсак, што ў сілу эканамічных фактараў аказаліся мацнейшымі, дзе ўжо была нейкая інфраструктура. А раз вёска абслугоўвае сельгаспрадпрыемствы, што зарабляюць грошы, то яе існаванне эканамічна апраўдана. І ўкладанні ў яе развіццё так ці інакш акупяцца.

Гэта быў чыста эканамічны аспект. Сухі і безэмацыянальны, нібы старонка бухгалтарскай справаздачы. А што да эмоцый... Знікненне любой вёскі — гэта, вядома, трагедыя. Сыходзяць у нябыт не толькі людзі, але і культура. Бо кожная вёска — гэта асобны невялічкі сусвет. І чалавеку, які вырас у гэтай мясцовасці, які памятае кожнае дрэўца, кожную хату, надзвычай балюча бачыць пустку замест роднага сяла.

Але прагрэс не зважае на эмоцыі. Ён рухаецца імкліва і няўмольна. З яго пункту гледжання, знікненне вёсак — гэта не выміранне, а аптымізацыя колькасці. І ладзяць гэтую аптымізацыю не чыноўнікі, а само Жыццё. А з ім спрачацца немагчыма. Якія асабістыя эмоцыі нас не перапаўнялі б, трэба разумець, што на дварах XXI стагоддзе. І цывілізацыя даўно пераскочыла і сельскагаспадарчы, і нават індустрыяльны этап свайго развіцця. І ў інфармацыйным грамадстве з яго інавацыйнай, інтэлектуальнай эканомікай «класічнай» вёсцы практычна не засталося месца. Хіба што ў выглядзе музеяў пад адкрытым небам.

Валянцін БОЙКА. *boika@zviazda.by*

БАНКЕТЫ, ТУРЫСТЫ І ДАЛЬНАБОЙШЧЫКІ

За кошт чаго выжывае прыдарожны сэрвіс?

Сёння прыдарожная сетка развіваецца згодна з Указам «Аб мерах па развіцці прыдарожнага сэрвісу» ад 2008 года, а таксама адпаведна генеральнай схеме развіцця на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах. З моманту падпісання ўказа прайшло ўжо дзевяць гадоў. І побач з абласнымі цэнтрамі прыдарожны сэрвіс цяпер развіты на высокім узроўні. Аднак як ідуць справы ў раёнах, далёкіх ад буйных гарадоў? Наш карэспандэнт паспрабаваў высветліць гэта на прыкладзе трасы М1, вядомай у народзе як «Алімпійка».

Сакрэт фірмы

Баранавіцкі раён знаходзіцца практычна пасярэдзіне паміж беларускай сталіцай і Брэстам. Участак трасы М1 тут складае 71 кіламетр. Усяго на ім размяшчаецца 8 аб'ектаў грамадскага харчавання — прыкладна адна ўстанова на кожныя 9 кіламетраў. **Кіраўнік аддзела эканомікі Баранавіцкага раённага выканаўчага камітэта Алена БЯГЕЗА** лічыць, што сітуацыя з прыдарожным сэрвісам у рэгіёне стабільная, і кіроўцы на працягу гэтага адрэзку маюць дастатковую колькасць кафэ.

«Яшчэ ў 2007 годзе мы праехалі па трасе і вызначылі месцы, дзе неабходна пабудаваць пункты харчавання, запраўкі. І на сённяшні дзень усе выдзеленыя тады пляцоўкі выкарыстоўваюцца па прызначэнні — гэта значыць, аб'екты на іх пабудаваны і функцыянуюць. Сёння ў нас ёсць толькі адна свабодная пляцоўка, якая знаходзіцца каля зубра (скульптура недалёка ад вёскі Петкавічы), і мы прапануем яе інвестару. Пакуль на яе няма пакупніка, аднак калі ўзнікне зацікаўленасць, то гэтую зямлю можна будзе атрымаць без аўкцыёну. Патэнцыяльнаму інвестару мы растлумачым усе магчымыя льготы і дапаможам выбраць найлепшы варыянт для рэалізацыі бізнесу».

На думку Алены Бягезы, паспяховасць работы прыдарожнай сеткі раёна звязана з блізкім размяшчэннем ад Баранавіч. «Мала таго, што аб'екты выкарыстоўваюцца як прыдарожны сэрвіс, таксама яны запатрабаваныя ў выхадныя і гараджанамі. У нас сапраўды прыгожыя пляцоўкі, на якіх можна добра адпачыць». Яшчэ адна прычына поспеху — гэта шматфункцыянальнасць такіх аб'ектаў. Заснавальнікі размяшчаюць іх побач, дзякуючы чаму наведвальнік можа атрымаць самыя розныя паслугі ў адным месцы. «Адзінкавы аб'ект, напрыклад, грамадскага харчавання не дае такой эфектыўнасці. У гэтым і заключаецца сакрэт: менавіта комплекс дапамагае зацікавіць вандроўніка. Каб побач былі СТА і гасцініца, крама і кафэ».

Мала турыстаў, шмат гараджан

Дырэктар прыдарожнай карчмы «Замак зубра» Наталля СЕРГЕЛЬ кажа, што грошы дазваляюць зарабляць буйныя мерапрыемствы, якія заказваюць жыхары Баранавіч, а таксама людзі з навакольных вёсак. Кафэ ратуюць банкеты і вяселлі, на якіх могуць замовіць каля 100 пасадачных месцаў. «Людзі, што праязджаюць міма, не далі б нам вялікай выручкі, — упэўнена Наталля. — Менавіта ўрачыстасці прыносяць асноўны даход». Таму блізкасць да населеных пунктаў сапраўды мае значэнне.

А колькасць падарожнікаў залежыць ад сезона, упэўнена Наталля. «Улетку, вядома, прыязджае значна больш людзей. А ў студзені спыняецца шмат расіян, якія едуць за мяжу. Цяпер бывае дваццаць, бывае трыццаць, а то і пятнаццаць кліентаў у дзень».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Абарот у звычайныя дні, калі ніякіх мерапрыемстваў няма, невялікі. На думку дырэктара карчмы, складана назваць нейкую адну прычыну, чаму выручка так моцна вагаецца. «Па-першае, у сувязі з складаным фінансавым становішчам у краіне пакупніцкая здольнасць падае і ў звычайнай краме, а што гаварыць пра рэстараны? Па-другое, мы знаходзімся ўсё-такі далёка ад горада». Але, нягледзячы на тое, што кафэ змяшчаецца наводшыбе і ўдалечыні ад заправак і крам, нават тут наведвальнікам прапаноўваюцца розныя паслугі. У будынку, напрыклад, месціцца міні-гатэль, у якім перыядычна спыняюцца вандроўнікі.

У адрозненне ад папярэдняга месца, побач з якім няма іншых прыдарожных пунктаў, насупраць кафэ «Стары сябар» ёсць яшчэ адно, а таксама аўтасэрвіс і магазін. «Вядома, тое, што мы размяшчаемся як бы ў комплексе, дапамагае прыцягнуць кліентаў, — кажа **дырэктар «Старога сябра» Наталля ЛАТЫШАВА.** — Таксама ў нас размяшчаецца турыстычна-інфармацыйны цэнтр, у якім можна набыць буклеты з інфармацыяй аб рэгіёне. Гэта прываблівае падарожнікаў». Акрамя таго, для прыцягнення кліентаў у кафэ актыўна выкарыстоўваюць прыемныя дробязі накшталт бясплатнага інтэрнэту.

«Найбольш прыбытковыя дні для нас — панядзелак, пятніца і субота», — адзначыла Наталля Латышава. На яе думку, найбольшая праблема прыдарожнага сэрвісу сёння — гэта малая колькасць кліентаў з ліку кіроўцаў і падарожнікаў, хоць траса М1 з'яўляецца дастаткова загружанай. Таму Наталля згодная з тым, што без банкетаў прыдарожным кафэ прыйшлося б вельмі цяжка. «Выключна ў якасці прыдарожнага сэрвісу зарабляць практычна немагчыма. Ратуе лета, бо ў нас у гэты час адкрываецца тэраса».

Уражанні падарожнікаў

А як ацэньваюць узровень прыдарожнага сэрвісу яго спажыўцы? **Студэнтка Ганна ЯНКОВІЧ** рэгулярна ездзіць з Мінска ў Пінск. Кіроўцы аўтобусаў пастаянна робяць санітарныя прыпынкі ў Баранавіцкім раёне. «Звычайна мы спыняемся побач з запраўкай за некалькі кіламетраў ад горада. Там жа ёсць кафэ-бар, у якім можна купіць усё неабходнае для дарогі, — ежу і сродкі гігіены». Прыпынкі недалёка ад Баранавіч робяцца таму, што горад знаходзіцца на паўдарозе ад Мінска.

На думку Ганны, мінусы прыдарожнага сэрвісу ў Баранавіцкім раёне сёння адсутнічаюць. «Мне камфортна ездзіць па гэтым маршруце. Хацелася б хіба пабольш крам уздоўж трасы, бо цэны ў кавярнях усё ж вышэйшыя, ды і асартымент меншы».

У цэлым узроўнем прыдарожнага сэрвісу на гэтым участку трасы задаволены і дальнабойшчыкі, аднак іх таксама турбуюць цэны. «Колькасць кафэ ўздоўж трасы М1 не выклікае пытанняў, — падкрэслівае **дырэктар кампаніі-грузаперавозчыка «Гранд-Алвад» Аляксандр ГУЗАРЭВІЧ. —** Але праблема ў тым, што для беларускіх дальнабойшчыкаў яны дарагія. Можа, для кіроўцаў-замежнікаў ці турыстаў цэны прымальныя».

Па словах Аляксандра, дальнабойшчыкі часцей спыняюцца на запраўках, дзе сёння таксама можна перакусіць і выпіць кавы. «Людзі жадаюць хутка заправіцца, падсілкавацца чым-небудзь — і паехаць далей. І цэны там больш даступныя», — кажа ён.

Сёння прыдарожны сэрвіс найбольш развіты каля адносна вялікіх гарадоў. Затое, напрыклад, у Стаўбцоўскім раёне, які знаходзіцца следам за Баранавіцкім у мінскім напрамку, уздоўж трасы практычна не засталося кафэ, якія працуюць. У мясцовым выканаўчым камітэце адказалі, што амаль усе прыдарожныя ўстановы, дзе можна было паесці, больш не функцыянуюць або «знаходзяцца на пераафармленні». Гэта значыць, што на ўчастку ў 38 кіламетраў кіроўцам няма дзе падсілкавацца, акрамя як на заправачных станцыях. Для параўнання: у Баранавічах жыве амаль 180 тысяч чалавек — гэта ў дзесяць разоў больш, чым насельніцтва Стоўбцаў. Выходзіць, што менавіта колькасць жыхароў найбліжэйшага горада, а не загружанасць трасы, вызначае прыбытковасць прыдарожнага кафэ.

Вось такі парадокс: установы адкрываліся для падарожнікаў, але рэальна трымаюцца за кошт гараджан. Кафэ працуюць, аднак без буйных мерапрыемстваў яны наўрад ці былі б рэнтабельнымі. Дый банкетаў не было б зусім, калі б пункты харчавання знаходзіліся далёка ад Баранавіч. А сапраўдны наплыў «падарожных кліентаў» бывае толькі летам.

Становішча звычайных кафэ ўскладняюць запраўкі, на якіх перакусіць можна танней. А менавіта на цэны ў першую чаргу звяртаюць увагу і кіроўцы, і пасажыры. Каб выйграваць канкурэнтную барацьбу, прыдарожным кафэ неабходна памяншаць кошт. Аднак ці гатовы ўласнікі пайсці на зніжэнне прыбыткаў? І ці застануцца іх установы пасля гэтага рэнтабельнымі? Што да заправак, то для іх грамадскае харчаванне — пабочны від дзейнасці, без якога яны ўсё адно мелі б грошы. Але ў любым выпадку неабходна прымаць нейкія захады, бо прыклад Стаўбцоўскага раёна паказвае, што цэлыя ўчасткі магістралі могуць застацца без аб'ектаў грамадскага харчавання наогул.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

Открытое акционерное общество «Брест-Юбилейный», местонахождение – г. Брест, ул. Московская, д. 328, почтовый адрес: 224023, г. Брест, ул. Московская, д. 328.
Способ реорганизации – присоединение к закрытому акционерному обществу «Юнифуд», местонахождение – г. Минск, ул. Притыцкого, д. 93, 4-й этаж, офис 11, почтовый адрес: 220136, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 93, 4-й этаж, офис 11.
Решение принято единственным акционером 20.02.2017 г.
Депозитарий – закрытое акционерное общество «Траст-Запад», г. Брест, ул. Советская, 93,95, комн. 46. УНП 200062076

Закрытое акционерное общество «Юнифуд», местонахождение – г. Минск, ул. Притыцкого, д. 93, 4-й этаж, офис 11, объявляет о своей реорганизации.
Способ реорганизации – присоединение к закрытому акционерному обществу «Юнифуд» следующих обществ: ООО «Витист», ООО «Алистэй», ОАО «Брест-Юбилейный».
Решение принято Общим собранием акционеров 20.02.2017 г.
Депозитарий – ООО «Промреестр», г. Минск, ул. К. Цеткин, 16. УНП 191304775

Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:
- квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) ф. 1-СУ серия СВ №0185900, 0199273, 0199311, 0203262, 0203276, 0548884, 0545356, 0546108, 0202839 и серия КС №8687265;
- полис «Добровольное страхование от несчастных случаев» ф. (2РН, 2РП) серия НС №0013262;
- «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» – (2РН, 2РП) серия БИ №1323064, 1323322, 1323404, 1345488, 1372523, 1372906, 1387329, 1387579, 1387581, 1387585, 1425797, 1457437, 1457575, 1466051, 1466105, 1486954, 1534103, 1541473, 1541640, 1541643, 1577960, 1454577, 1508504-1508506, 1508508, 1577927, 1546841;
- «Добровольное страхование имущества физических лиц; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» ф. 2РН, 2РП серия БИ №0037238, 0037239, 0038366;
- «Универсальный» ф. 2РН, 2РП серия УП №0006228–0006229.
УНП 100782388

ОТЧЕТ
Местного благотворительного культурно-исторического Фонда памяти Первой мировой войны «КРОКІ» по использованию своего имущества за 2016 год (учредители – 3 человека)
1. Учредительный взнос – 1669 руб.
2. Поступление от проводимых мероприятий – 155 руб.
3. Спонсорская помощь – 12 477 руб.
4. % банка –10 руб.
По состоянию на 1.02.2017 г.
1. Остаток на счету – 15 руб.
2. Долгосрочные активы – 22 990 руб.
3. Краткосрочные активы – 2133 руб.
Итого – 25 138 руб.
Сумма расходов, понесенных на общественно полезные цели, – 50 014 руб.
Предпринимательская деятельность не велась.
Хозяйственные общества и УП не создавались. УНП 691150277

Утерянную печать ООО «Адорадобел», УНП 192416282, считать недействительной.

ДАРОГА ЖЫЦЦЯ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Чытачка «Звязды» Ала СУЗДАЛЕВА расказвае пра сваю праблему.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

А вось ад садаводчых таварыстваў — стосы скаргаў. «Мне дачнікі і пішуць рэгулярна, і тэлефануюць, — кажа Уладзімір Саевіч. — То хочуць, каб заасфальтавалі дарогу да дачнага пасёлка, то наракаюць, што праехаць да леціша не могуць — снегу намяло. Але перш за ўсё абслугоўваюцца галоўныя транспартныя магістралі. Пасля — другарадныя дарогі. А ў апошнюю чаргу — праезды да садаводчых таварыстваў. Так прапісана ў нарматыўных дакументах».

Дарожнікі мусяць дбаць найперш пра інтарэсы жыхароў свайго раёна. Для вяскоўцаў парушэнне транспартных зносін — не проста дыскамфорт, пра які можна гнеўна пісаць у інтэрнэце. Гэта пытанне выжывання: не паўсюль жа ёсць крамы і бальніцы. А дача — гэта ўжо дадатковая выгода. Але менавіта дачнікі найбольш актыўна адстойваюць свае інтарэсы.

Як згубіўся «кавалак» вёскі

Тым часам мы мінаем Ракаў — цэнтр сельсавета. Пасля асфальту пачынаецца гравійная дарога. Пад снегам самога пакрыцця не відаць. Мой спадарожнік тлумачыць, што снежны накат дапускаецца. Галоўнае, што ён пяском пасыпаны. Легкавік ідзе бадзёра: кіламетраў 60—70 за гадзіну. Значыць, праедуць і «хуткая», і аўтакрама. Вось і знак «Туркаўшчына». І тут пачынаецца квэст: патрэбнага нумара дома мы так і не знаходзім. Стукаемся ў крайнюю хату. «Дык вам трэба вунь за тую горку», — тлумачыць гаспадыня.

Маленькі Макар з бабуляй.

Далей кіруемся па той самай праблемнай дарозе Н-8345. Абапал, нібы грыбы, туляцца адзін да аднаго дачныя домікі. Гэта ўжо садовае таварыства. І вось мы на месцы.

— Дык вы дачніца? — павітаўшыся, цікаўлюся я ў гаспадыні хаты.

— Што вы! Я ўсё жыццё тут жыву, і бацькі мае тут жылі! Гэтых дач яшчэ не было, а наша хата стаяла!

— А як жа вас так далёка ад вёскі занесла?

...За польскім часам у гэтых краях заахвочвалася хутарская сістэма. Таму тыповая вёска на Валожыншчыне — гэта не роўны шнур дамоў уздоўж дарогі, а жменя рассыпаных па наваколлі хат. І чатыры дамы, у адным з каторых жыве наша чытачка Ала Суздалева, таксама былі хутарам. Пасля яго аб'ядналі з вёскай Туркаўшчына, да якой кіламетр з гакам. А навакольныя землі адвялі пад лецішчы. І пакрысе чатыры хаты ператварыліся ў вясковы «анклаў» пасярод дачнага пасёлка. На карце гэтае месца пазначана як «садаводчае таварыства «Крышталь». А «кавалка» вёскі нібыта няма.

Але ж у рэальнасці ён існуе. І праблемы яго жыхароў рэальныя. Ала Уладзіміраўна, будучы пенсіянеркай, трымае дзвюх кароў, а ўзімку яшчэ наймаецца вартаўніком у садаводчае таварыства. Усё дзеля таго, каб выгадаваць унука. «Мая дачка была замужам, жыла ў Мінску, — расказвае жанчына. — Але пасля яны развяліся, і дачка разам з дзіцем вярнулася сюды. Цяпер штодня ездзіць у суседнюю вёску: у дзіцячым садзе працуе. А я ўнука дапамагаю гадаваць».

«Я за ўнука перажываю»

Маленькаму Макару было паўгода, калі яны з мамай пераехалі ў бабуліну хату. Цяпер хлопчыку амаль шэсць, і ўвосень сям'я хоча аддаць яго ў школу, у суседнюю вёску Пятрышкі, што ў Мінскім раёне. Але як ён будзе штодня туды дабірацца — галоўная праблема.

— Да нашага хутара маршруткі ходзяць толькі ўлетку і ўвосень, — скардзіцца Ала Уладзіміраўна. — А ўзімку іх няма, бо дарога кепская. Гэта цяпер расчысцілі, а звычайна страх што робіцца! Часам і аўтакрама пад горкай буксавала! А калі дзіця захварэе і «хуткая» з Ракава не праб'ецца да нас? Каб не старшыня сельскага Савета — дык зусім прапалі б! Яму пазвоніш — прыедуць і параўняюць трохі, пачысцяць. Але ж гэта на тыдзень-два. А пасля дождж ці снег — ізноў бездарожжа! Тут адна рада — класці асфальт!

Размова перарастае ў дыскусію. Начальнік ДРБУ прымае крытыку, але не згодны з ёй да канца: «Напэўна, часам складана праехаць. Але гэтай зімой не было выпадкаў, каб да вас не даехала аўтакрама або пошта. А пошта, дарэчы, ездзіць штодня. І нашы супрацоўнікі заўсёды рэагуюць, калі звяртаецца старшыня Савета. Але ж і вы зразумейце: у нас інструкцыі. І мы павінны спачатку чысціць і добраўпарадкоўваць галоўныя дарогі, а астатнія — па меры вызвалення людзей і тэхнікі».

Дарогу Н-8345 перадалі на баланс ДРБУ №167 толькі ў пачатку «нулявых». Натуральна, што ладзіць тут асфальтавае пакрыццё не спяшаліся, бо хапае больш значных дарог, якія патрабуюць рамонту. І штогод камісія пры райвыканкаме вызначае ўчасткі, за якія трэба ўзяцца ў першую чаргу. Пералік зацвярджаецца раённымі выканаўчай і прадстаўнічай уладамі і публікуецца ў мясцовай газеце. Сёлета валожынскія дарожнікі маюць намер адрамантаваць 45 км асфальтабетонных дарог і заасфальтаваць амаль 8,5 км гравіек. Але дарогі Н-8345 у спісе пакуль няма. Логіка відавочная: у ваколіцах Туркаўшчыны адсутнічаюць сельгаспрадпрыемствы. Гэта, па сутнасці, дачны край. А мясцовыя ўлады, маючы абмежаваныя сродкі, забяспечваюць транспартныя зносіны найперш з эканамічна актыўнымі вёскамі.

> Ці можна знайсці раўнавагу паміж інтарэсамі буйных вёсак і маленькіх хутароў? Як ні круці, але сацыяльныя стандарты для ўсіх павінны быць аднолькавыя. Але адказу пакуль няма.

Застаецца магчымасць заасфальтаваць дарогу за кошт дачнікаў і іншых зацікаўленых. Аднак ці возьмецца нехта сабраць сродкі? «Садаводчае таварыства — гэта свайго кшталту «дзяржава ў дзяржаве», — тлумачыць **старшыня Ракаўскага сельскага Савета Аляксандр МЯКІНКА.** — У яго свой статут, свае правілы. І ўмешвацца ў яго дзейнасць і абавязваць збіраць нейкія грошы мы не маем права. Рашэнне аб гэтым можа прыняць толькі само таварыства. Аднак сярод дачнікаў многа пенсіянераў. І іх даходы наўрад ці дазволяць удзельнічаць у пабудове дарогі, бо гэта вялізныя грошы». І сапраўды: як падлічылі спецыялісты ДРБУ №167, на асфальтаванне праблемнай дарогі спатрэбілася б прыблізна 95 тысяч рублёў. Гэта пры цяперашніх цэнах. Таму варыянт скласціся ўсёй грамадою выглядае фантастычным.

* * *

«У кожнай праблемы ёсць імя, прозвішча і імя па бацьку», — гэтае выказванне прыпісваюць аднаму з кіраўнікоў СССР. Але тут фармальна вінаватых няма. Дарожнікі дзейнічаюць згодна з інструкцыямі. Мясцовая ўлада кіруецца эканамічнай мэтазгоднасцю і кідае сілы і сродкі на самыя «балючыя» ўчасткі. І праблема не ўнікальная: падобныя сітуацыі ёсць ці не ў кожным раёне. Але жыхарам колішняга хутара Адамарына ад гэтага лягчэй не становіцца. Ці можна знайсці раўнавагу паміж інтарэсамі буйных вёсак і маленькіх хутароў? Як ні круці, сацыяльныя стандарты для ўсіх павінны быць аднолькавыя. Але адказу пакуль няма. «Я ўжо куды толькі ні пісала: і ў газеты, і дэпутатам, — уздыхае Ала Уладзіміраўна. — Мне самой яно не вельмі і трэба. Я за ўнука перажываю. Бо для яго гэта — дарога жыцця».

Валянцін БОЙКА. *boika@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Ф-л «Несвижское управление магистральных газопроводов ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», Минская обл., г. Несвиж
Предмет аукциона	
Демонтированное оборудование АГЗС, расположенное по адресу: Минская обл., г. Несвиж, ул. Сновская, 7	
Лот №1	
Мерник для сжиженных газов ММСГ-1	
Начальная цена с НДС 20%	**1 571,58 белорусского рубля (BYN)**
Лот №2	
Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа	
Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа	
Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC	
Раздаточная колонка сжиженного газа Petrolmeccanica LPG 6000P	
Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой	
Начальная цена с НДС 20%	**14 894,82 белорусского рубля (BYN)**
Лот №3	
Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа	
Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа	
Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC	
Раздаточная колонка сжиженного газа Petrolmeccanica LPG 6000P	
Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой	
Начальная цена с НДС 20%	**14 894,82 белорусского рубля (BYN)**
Лот №4	
Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа	
Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа	
Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC	
Раздаточная колонка сжиженного газа DPC050 LE1D	
Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой	
Начальная цена с НДС 20%	**14 988,64 белорусского рубля (BYN)**
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона
Условия оплаты предмета аукциона	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Дата и время проведения аукциона	**27.03.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**24.03.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Извещение о созыве общего собрания акционеров

Уважаемые акционеры ОАО «Универмаг «Солигорск»!
27 марта 2017 года состоится общее собрание акционеров

ОАО «Универмаг «Солигорск»,

расположенного по адресу:
223710, Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 39.
Собрание пройдет по адресу:
г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4-й этаж, актовый зал

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и об основных направлениях деятельности общества в 2017 году.
2. Отчет о работе наблюдательного совета Общества за 2016 год.
3. Отчет о работе ревизионной комиссии Общества за 2016 год. Заключение по результатам проведенной ревизии финансово-хозяйственной деятельности Общества по годовому отчету, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой отчетности) Общества за 2016 год с учетом аудиторского заключения.
5. Утверждение распределения и использования чистой прибыли Общества за 2016 год.
6. Утверждение направлений и нормативов распределения и использования чистой прибыли Общества на 2017 год.
7. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2016 год.
8. Периодичность выплаты дивидендов за 2017 год.
9. Избрание членов наблюдательного совета Общества.
10. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
11. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
12. Утверждение в новой редакции Регламента работы ОАО «Универмаг «Солигорск» с реестром владельцев ценных бумаг.

С материалами, подготовленными к собранию, в том числе с информацией о деятельности общества за отчетный период, можно ознакомиться по адресу: г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4-й этаж, кабинет «Отдел кадров» с 3 марта по 26 марта 2017 года в рабочие дни (время работы с 8.00 до 17.00) либо 27 марта 2017 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 13.45** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 27 марта 2017 года, 14.00.

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на **01 марта 2017 года.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет

ИНФОРМАЦИЯ О ФОРМИРОВАНИИ РЕЕСТРА ВЛАДЕЛЬЦЕВ ЦЕННЫХ БУМАГ

Открытое акционерное общество «Универмаг «Солигорск», ул. Ленина, 39, г. Солигорск, Минская обл., 223710, информирует о формировании реестра владельцев ценных бумаг для составления списка лиц, имеющих право на участие в очередном общем собрании акционеров на дату 1 марта 2017 года. Решение принято наблюдательным советом 21 февраля 2017 года.

УНП 600024725

НА ХУТАРЫ

Лісічкі за хлявом, журавіны за плотам і... уласны лес

Непатрэбныя хаты і пустыя вёскі, згубленыя сярод палёў і лясоў хутары, якія паціху руйнуе сама прырода ці калгасныя бульдозеры... Гэта адзін з магчымых сцэнарыяў развіцця беларускай вёскі.
А па іншым — тыя, хто прагне яднання з прыродай, набываюць хаты менавіта ў аддаленых ад гарадоў ды аўтамагістраляў мястэчках і нават на хутарах. Бадай што самы багаты на такія мястэчкі для адасобленага жылля — Воранаўскі раён на Гродзеншчыне, дзе на 335 населеных пунктаў прыходзіцца больш за 800 хутароў. Тыя, хто застаўся гаспадарыць на іх, не пагаджаюцца прамяняць сваю «адзіноту» з гаючым паветрам і ляснымі скарбамі ні на якія гарадскія выгоды.

Мар'ян і Гелена ВІНЦКЕВІЧЫ

Яшчэ тая загартоўка

Для часткі Заходняй Беларусі, якая была калісьці пад польскай уладай, увогуле характэрная хутарская сістэма.

— Масава ўтварацца хутары сталі ў 1930-х гадах, калі палякі пачалі раздаваць зямлю людзям. Апрацоўваючы свае асабістыя гектары, вяскоўцы будавалі там хаты, пераязджалі на надзел жыць. Зямля цалкам стала прыватнай. Мой 92-гадовы бацька — сведка тых часоў. Ён успамінае, як цяжка давалася гэтая апрацоўка. Трапіцца табе ўчастак з лесам, і пакуль яго выкарчуеш на конях, пакуль разарэш... — расказвае **Віктар РОІК, старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў,** які сам вырас на хутары. — У нас людзі тут свабадалюбівыя, аднаасобнікі, можна сказаць, і ім так падабаецца жыць.

У Воранаўскім раёне калісьці было каля 1200 адасобленых адзін ад аднаго падворкаў, аддегласць паміж якімі ў некалькі кіламетраў лічылася «жыццём па-суседску». Хоць хутарам тут называюць і пасяленне з 3—5 хат, якія стаяць недалёка адна ад адной. Закінутае жыллё руйнуюць, забіраючы зямлю пад палі. А большасць з хутароў, якія яшчэ існуюць, — нежылыя. Аднак тыя, дзе жывуць людзі, здзіўляюць сваёй самавітасцю і наладжанай гаспадаркай.

Два разы на год кожны хутар наведвае аглядная камісія: старшыня сельскага Савета, прадстаўнікі аддзела па надзвычайных сітуацыях, энерганагляду, фельдшарска-акушэрскага пункта, сацыяльны педагог (калі ў доме жывуць дзеці).

— Кожны раз высвятляем, што патрэбна, абследуем жыллё. Адзінокім старым, калі трэба, бясплатна рамантуем печ і мяняем электраправодку. Тым, у каго ёсць дзеці, даём час на ўстараненне праблемы, — расказала пра сувязь з хутаранамі **старшыня Гіркаўскага сельскага Савета дэпутатаў Святлана МУШЫНСКАЯ.** — Той, хто мацнейшы з жыхароў, сам праблему вырашае ці спецыяліста выклікае. Заўжды трымаем сувязь з насельніцтвам — інакш нельга.

Школьнікаў два разы да абеду і адзін раз пасля ўрокаў возіць спецыяльны аўтобус. Дзяцей выводзяць у пэўныя месцы каля дарогі, адкуль іх забіраюць. Тры разы на тыдзень па цэнтральных дарогах паміж хутарамі ходзіць аўтакрама, спыняецца на скрыжаванні дарог. Прыватнікі ўвогуле да кожнага хутара пад'язджаюць.

— Тыя, каму цяжка перазімаваць аднаму, ездзяць да дзяцей або ўладкоўваюцца ў дамы кругласутачнага знаходжання, а вясной вяртаюцца дахаты. Гэта людзі старой загартоўкі. Пакуль рухаюцца — яны жывуць, — дадае старшыня Савета.

Сяджу, як у раі

82-гадовая **Яніна СТАНКЕВІЧ** — першая гаспадыня, на хутар якой мы завіталі. Адразу за яе падворкам растуць бярозы, навокал раскінуліся палі. Па дарозе, што вядзе да хаты, не кожная машына ўзімку ды па непагадзі праедзе. Апошні год (пасля таго, як у жанчыны здарылася праблема з пазваночнікам) тройчы на тыдзень яе наведвае супрацоўніца сацыяльнай службы. Пра яе хутаранка кажа: «Чэся глядзіць мяне добра. Калі дзеці не даедуць, яна заўжды тут. І пагаворыць, і прыбярэцца, і хлеба прынясе, і да хлеба».

Яніна Феліксаўна родам з Літвы, але выйшла замуж за мясцовага і ўсё жыццё правяла на беларускім хутары, нарадзіла двух сыноў і дачку. Саматканыя пакрывалы, накідкі на падушкі, дарожкі, ручнікі — усё зроблена яе рукамі.

Цяжкай вясковай працай дапамагала ўсім дзецям вучыцца і будаваць катэджы. «Ніводзін з граблямі не ходзіць, дала ім хлеб у рукі, хоць сама і непісьменная», — кажа яна. У вёску, бліжэй да людзей, Яніна Феліксаўна не хоча, бо «чужое там усё».

— Мне муж нябожчык казаў: «Янусенька, жыві ў сваёй хаце». Я і жыву, бо, як кажуць, там свой куток, дзе рэзаны пупок. А як кепска стане, выйду, падыхаю — і лягчэй мне. Дай божа жыць на прыродзе. Я кветак насаджу ўвесну і сяджу, як у раі, — расказвае жанчына.

Пры гэтым хутаранка не залежыць ад дзяцей і нават дапамагае ім.

— Каб вы летам паглядзелі, колькі тут грыбоў ды ягад. Я летась на 5 мільёнаў старымі грашыма здала лісічак. Выйдзеш за хлеў — уся зямля жоўтая, па 12 кілаграмаў збіраю. Яшчэ і агарод садзіла — хачу, каб кавалак хлеба ў мяне быў, бо дзеці мае сваіх дзяцей вучаць.

Летась жанчына сама накалола і злажыла ў павець два прычэпы дроў. Яна дагэтуль любіць спячы сабе булку, бо «свая ж смачнейшая», і сушыць грыбы ў печы. Летам, кажа, зноў у ягады пойдзе.

У гасцях у Яніны СТАНКЕВІЧ.

Не лянуйся — і ўсё будзе

Мар'ян і Гелена ВІНЦКЕВІЧЫ жывуць на хутары, дзе недалёка яшчэ пару хат, у тым ліку і будынак сына з нявесткай, якія даглядаюць старых. Абодвум гаспадарам пад 80.

Зямля ды хата дасталіся Вінцкевічам ад бацькоў гаспадыні. Колькі было гектараў, цяпер і не ўспомніць.

— Ад хаты і да лесу надзел з кіламетр, і яшчэ на вёсцы быў участак. Цяпер ужо той зямлі няма, лесам засадзілі, — кажа Гелена Янаўна.

З жыўнасці на хутары — свінні ды куры. «Індык у нас адзін, затое ён за курамі глядзіць, ад крылатых драпежнікаў бароніць», — жартуе Мар'ян Дамінікавіч.

Гаспадар дагэтуль ходзіць паляваць на зайцоў ды ліс і абкошвае падворак звычайнай касою. А на грыбы палюе з такім азартам, што жонка смяецца: «Аж злуюся на яго, што кошыкамі прыносіць, бо мне ж усё гэта перабіраць». Сама яна, дарэчы, яшчэ пяць гадоў таму бярозавік цягала з лесу — па 35 літраў.

— Жыць добра. Толькі здароўя няма. Рукі застудзіла ў мінулым годзе — мыла ў сцюдзёнай вадзе бульбу. Ранкам пальцы анямелі на адной руцэ. Думаю ў бальніцы паляжаць, можа, адагрэюць руку, бо хочацца яшчэ кароўку патрымаць, каб сваё малако мець і смятану. На зямлі ж як? Не лянуйся — і ўсё будзе, — кажа яна.

Хутар-катэдж

Наступны хутар, які мы наведалі, — сапраўдны катэдж звонку і ўнутры: вялікі, утульны, з ацяпленнем, санвузлом, ваннай з гарачай вадой і еўрарамонтам. Гаспадарам пашанцавала правесці сюды газ, бо лінію па полі цягнулі акурат за некалькі метраў ад хаты. Дзевяць гадоў **Мечыслаў і Тэрэса ДЗЯНЬКОЎСКІЯ** збіралі грошы, каб зрабіць з «хаткі на курыных лапках» ладны дом, а пасля яшчэ тры гады рамантавалі яго. На стале — яблыкі, мёд, таматны сок, клінковы сыр — усё сваё.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Тэрэса ДЗЯНЬКОЎСКАЯ са сваёй гаспадаркай.

Гаспадар працуе інжынерам-механікам, на ім, кажуць, уся тэхніка ў калгасе трымаецца. Адвучыў работнікаў мехдвара піць і курыць. Гаспадыня — санітарка на палову стаўкі. Пры гэтым яны паспяваюць апрацоўваць тры гектары зямлі, трымаць дзвюх кароў, бычка, цялят, авечак і два вуллі. Хутаране набылі для сваёй гаспадаркі ўсю тэхніку: трактар і абсталяванне да яго, грузавік, бульбаўборачны камбайн.

Кароў Тэрэса доіць сама. Авечак гадуюць на продаж, толькі праблема, што няма куды воўну здаваць.

Сына-адзінаццацікласніка і сямікласніцу-дачку ў школу бацькі завозяць на мікрааўтобусе, назад дзеці вяртаюцца на школьным аўтобусе.

Ад бацькі і дзеда маладым засталіся яблыневыя сады. На продаж і сабе яны вырошчваюць расаду памідораў і самі таматы.

— Памідорамі я займаюся перш за ўсё для ўласнай уцехі, а не дзеля даходу. І муж лічыць, што грошы — не галоўнае ў жыцці, яму праца на зямлі прыносіць задавальненне, — кажа гаспадыня.

Акрамя таго, Тэрэса ў лесе збірае журавіны, брусніцы, грыбы.

— Лес — вунь жа ён, адразу за плотам — яшчэ свёкар каля дзесяці сотак елак ды бярозак калісьці насадзіў, — кажа яна. — І на Новы год куплялі заўжды елку, свае не ссякалі... Добра на хутары жыць, асабліва летам. Толькі што дзецям на канікулах сумна, бо сябры далекавата. А нам з мужам лепшага і не трэба, як тут.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@sviazda.by*

Больш здымкаў глядзіце на сайце www.zviazda.by.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 21 лютага 2017 года.

■ Іншы погляд

РАБОТА ДЛЯ ЧАЛАВЕКА З ПСІХОЗАМ

Як дапамагчы людзям з псіхічнымі захворваннямі перамагчы поўную ізаляцыю?

Даследаванні паказваюць, што амаль палова апытаных кафедрай псіхалогіі БДУ рэспандэнтаў згодныя з тым, што псіхічна хворыя часцей учыняюць злачынствы, чым звычайныя людзі. 60 працэнтаў перакананыя, што хворыя часцей здзяйсняюць самазабойства, 90 працэнтаў ухваляюць прымусовую шпіталізацыю, 40 — абмежаванне правоў хворых, а 55 выказваюцца за прымусовы кантроль над нараджальнасцю сярод хворых. Пры гэтым мала хто знаёмы з галоўнымі сімптомамі душэўных хвароб, тым больш, ніхто не задумваецца, як жывецца людзям з псіхічнымі захворваннямі ў грамадстве, дзе адсутнічае паўнацэнная сістэма сацыяльнага суправаджэння.

У свеце адзначаецца рост колькасці людзей з псіхічнымі захворваннямі. Па прагнозах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, да 2020 года псіхічныя расстройствы акажуцца ў першай пяцёрцы хвароб, якія прыводзяць да страты працаздольнасці. На ўліку ў псіханеўралагічных арганізацыях Беларусі з дыягназамі псіхозу, шызафрэніі, разумовай адсталасці і іншымі — 107 тысяч чалавек, і гэта лічба таксама прырастае. Сучасная фармакатэрапія дазваляе хутка зняць прыступ, скараціць тэрмін шпіталізацыі, але... што далей? Добра, калі дома чакае хоць бы сваяк, які падтрымае, а калі раптам акажашся адзін? Значыць, поўная бездапаможнасць і ізаляцыя?

Якасць жыцця гэтых людзей застаецца вельмі нізкай, а прычына ў тым, што рэабілітацыя ў іх выпадку доўгі час была магчымай толькі ў межах псіхіятрычных устаноў Міністэрства аховы здароўя, крыху пазней — у аддзяленнях дзённага знаходжання тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дый тое — для тых, у каго ёсць інваліднасць. Але далёка не ўсе людзі з псіхічнымі захворваннямі атрымліваюць групу. Больш за тое, самі такія аддзяленні не маюць дастаткова рэсурсаў і не валодаюць рэабілітацыйнымі тэхналогіямі, якія адновяць здольнасць жыць і быць паўнавартаснымі членамі грамадства. Мясцовая, па месцы жыхарства, нефармальная падтрымка (праз сяброў, групы самадапамогі, валанцёраў, сацыяльныя сеткі) з'яўляецца, на думку замежных экспертаў, больш значнай і неабходнай, чым паслугі псіхіятрычных бальніц і ўстаноў закрытага тыпу. І затраты пры гэтым — істотна ніжэйшыя. Колькасць псіхіятрычных бальніц павінна скарачацца, а больш шырока трэба развіваць службу аховы псіхічнага здароўя па месцы жыхарства, у бальніцах агульнага профілю, ствараць невялікія таварыствы і абшчыны. Каб пасля выпіскі са стацыянара хворы не аказваўся сам-насам з адзінотай.

Псіхасацыяльная работа даўно атрымала ў свеце альтэрнатыўныя формы. Яе зачаткі ёсць ужо і ў нас. Напрыклад, такая міжнародная мадэль сацыяльнай службы, як Клубны дом. Гэтай мадэлі ўжо амаль 70 гадоў. Членства даступнае любому чалавеку з псіхічным захворваннем. Паспяховая апрабацыя мадэлі адбылася яшчэ ў 2011-м у Мінску пры фінансавай падтрымцы фонду «Акцыя-Чалавек» (Германія), што дазволіла Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў прыступіць да стварэння сеткі такіх дамоў па краіне. У 2015-м асацыяцыі сацработнікаў і псіхатэрапеўтаў прыступілі да рэалізацыі праекта «Сацыяльная прастора для людзей з псіхічнымі праблемамі: грамадскі дыялог на рэспубліканскім узроўні і ў мясцовых таварыствах» (пры фінансавай падтрымцы Праграмы малых грантаў пасольства ЗША). Першай пляцоўкай у рэгіёнах быў абраны Брэст. Дзяржзаказчык — упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Брэсцкага гарвыканкама — за кошт сродкаў бюджэту дало субсідыі на вяртанне расходаў на заработную плату супрацоўнікаў, якія ажыццяўляюць сацыяльна-псіхалагічную падтрымку. Спецыялісты прайшлі стажыроўку ў сталіцы, адабралі для пачатку 7 чалавек з псіхічнымі захворваннямі, прыдумалі назву — «Калейдаскоп». Сёння членамі гэтага клуба з'яўляюцца ўжо 34 чалавекі (16 мужчын і 18 жанчын ва ўзросце 19—41 гадоў), 2 супрацоўнікі і 4 пастаянныя валанцёры.

— Клубны дом імкнецца дапамагчы членам уладкавацца на пасільную работу, удзельнічаць у адукацыйным працэсе, вырашыць пытанні з жыллём, палепшыць здароўе, атрымаць доступ да лепшых медпаслуг, скараціць колькасць шпіталізацый, а ў якасці дадатковага кампанента прадугледжана арганізацыя вольнага часу, — расказвае **кіраўнік Клубнага дома «Калейдаскоп» Крысціна ХАВАНСКАЯ.** — Дзень пачынаецца з рабочага сходу членаў клуба, на якім вырашаецца, хто ў якой секцыі і якую работу будзе выконваць. Кожны сам вырашае, ці будзе ён наогул што-небудзь сёння рабіць. За першы год работы мы садзейнічалі працаўладкаванню трох чалавек. Адзін з трэцяй групай інваліднасці быў уладкаваны адміністратарам у цэнтр сацыяльнага абслугоўвання Ленінскага раёна Брэста, другі — без групы інваліднасці — стаў кур'ерам па раздачы лістовак у кантактным заапарку, трэці — з другой групай — падсобным рабочым на швейным прадпрыемстве. Аказваем інфармацыйную, псіхалагічную падтрымку сваякам...

«Калейдаскоп» — адзіная ў Брэсце ўстанова сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі людзей з псіхічнымі расстройствамі, якая знаходзіцца па-за межамі лячэбнай установы. А водгукі членаў клуба кажуць самі за сябе. Вось што кажа Таццяна: «Мне вельмі падабаецца Клубны дом «Калейдаскоп». Там вельмі весела. Знайшла сабе сяброў, сябровак, шмат чаму навучылася. Характар змяніўся. Шмат што робім. Ходзім у тэатры, кінатэатры, на выставы. Наведваем іншыя месцы і ўстановы. Арганізуем мерапрыемствы, гуляем. Я не шкадую аб тым, што прыйшла сюды».

Клубныя дамы паспяхова працуюць у 40 краінах свету. У нас яны паступова з'яўляцца ва ўсіх абласных гарадах. На чарзе — Віцебск і Гродна. Хоць у ідэале, зразумела, такія структуры павінны быць як мінімум у кожным горадзе.

— Сёння мы кажам аб неабходнасці распрацоўкі Дзяржаўнай праграмы сацыяльнай падтрымкі людзей, якія пакутуюць ад псіхічных захворванняў, і вельмі важна, каб самі гэтыя людзі мелі магчымасць стаць экспертамі падчас распрацоўкі тых ці іншых мер, — зазначае **выканаўчы дырэктар Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў Алена СТАНІСЛАЎЧЫК.** — Акрамя таго, мы павінны больш актыўна прыцягваць да рэалізацыі рэабілітацыйных мер, развіцця сацыяльнай сферы наш прыватны сектар. Вядома, што ў Германіі работадаўцы зацікаўлены ў тым, каб браць на работу людзей з інваліднасцю, у процілеглым выпадку яны выплачваюць падатак, які ў сваю чаргу накіроўваецца на патрэбы такіх людзей. Нам гэта здаецца недасягальным, але варта ісці менавіта па такім шляху. Бо калі не прымаць дастатковых рэальных мер па арганізацыі сацыяльна-псіхалагічнай і працоўнай рэабілітацыі людзей з псіхічнымі захворваннямі, то мы рызыкуем вярнуцца ў той час, калі псіхічнае захворванне было праклёнам і пакараннем

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

■ Візіт да афтальмолага

КАЛІ ПРАДМЕТЫ ЗДАЮЦЦА ХВАЛІСТЫМІ...

Узроставая макулярная дэгенерацыя — галоўная прычына парушэння зроку пасля 50.

У групе рызыкі — найперш жанчыны, людзі, у каго падобную праблему мелі блізкія сваякі, тыя, хто курыць і злоўжывае алкаголем, мае лішнюю вагу, падвяргаецца павышанаму сонечнаму абпраменьванню, перанёс хірургічную аперацыю на вачах і пакутуе ад сардэчна-сасудзістага захворвання.

Наогул, праблема хваецца ў пашкоджанні сінім святлом макулы, якая адказвае за вастрыню зроку і адчуванне колеру. Затрымліваюць святло і такім чынам забяспечваюць антыаксідантную абарону лютэін і зеаксанцін, якія мы атрымліваем з ежай і якія назапашваюцца ў макуле. Аднак з узростам канцэнтрацыя лютэіну зніжаецца. Замежныя даследаванні паказалі эфектыўнасць біялагічна актыўных дабавак, якія змяшчаюць лютэін і зеаксанцін, у прафілактыцы і зніжэнні рызыкі макулярнай дэгенерацыі.

— «Сухая» форма захворвання працякае менш цяжка і развіваецца паступова — у адрозненне ад «вільготнай», але ў любым выніку вастрыня зроку зніжаецца, — тлумачыць **урач-афтальмолаг 13-й гарадской паліклінікі Мінска Юлія РЫЖЭЎСКАЯ.** — Пры «вільготнай» форме ў сятчатцы з'яўляюцца новыя сасуды, якія маюць тонкую сценку. З іх у сятчатку пачынае прасочвацца плазма крыві, з'яўляюцца кровазліцці. Яны сціскаюць і пашкоджваюць сятчатку, зніжаюць вастрыню зроку і выклікаюць утварэнне рубцоў, што прыводзіць да незваротнай страты зроку. Пацыент можа пры гэтым бачыць у цэнтры поля нерухомую цёмную пляму, або прадметы стануць хвалістымі.

Пры «сухой» форме спатрэбіцца антыаксідантная абарона макулы, а пры «вільготнай» — фотадынамічная тэрапія, лазерная каагуляцыя, увядзенне спецыяльных прэпаратаў. Дабіцца лепшага выніку лячэння ўдасца, калі вастрыня зроку будзе яшчэ не ніжэй 3—5 радкоў

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении очередного Общего собрания акционеров
ОАО «Белбуд»
Уважаемые акционеры!

Открытое акционерное общество «Белбуд», расположенное по адресу: 220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, сообщает о проведении очередного Общего собрания акционеров в очной форме.

Собрание состоится 23.03.2017 в 15.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, конференц-зал.

Регистрация участников производится по месту проведения собрания 23.03.2017 с 14.30 до 14.50 на основании списка лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2016 году и основных направлениях развития Общества на 2017 год.

2. Утверждение заключений аудиторской и ревизорской проверок финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.

3. Утверждение годового бухгалтерского баланса и отчета о прибыли и убытках Общества за 2016 год.

4. Утверждение распределения чистой прибыли за 2016 год и направления ее использования в 2017 году.

5. Определение рекомендуемого размера вознаграждения и компенсаций расходов членам Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.

6. Избрание членов Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии.

Для регистрации необходимо иметь при себе паспорт, представителю акционера – доверенность и паспорт.

Лица, имеющие право на участие в общем собрании акционеров, могут ознакомиться с документами, подготовленными к собранию, с 13.03.2017 (понедельник-четверг – с 8.30 до 17.00, пятница – с 8.30 до 16.00, обед с 13.00 до 13.20) по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис №1 (в приемной генерального директора), а в день проведения Собрания – по месту его проведения.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 20.03.2017.

Телефон для справок – 8017 237 29 50.

УНП 100794022

24 марта 2017 года в 14.00
состоится общее собрание акционеров
совместного предприятия
ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Могилевский химкомбинат «Заря»
с повесткой дня:

1. Отчет о проделанной работе за 2016 год.

2. Итоги производственно-хозяйственной деятельности СП ЗАО «МХЗ» за 2016 год.
Утверждение годовых отчетов, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2016 год.

3. Распределение прибыли (убытков) по результатам работы за 2016 г.

4. Отчет ревизионной комиссии.

5. Основные направления деятельности СП ЗАО «МХЗ» на 2017 год. Утверждение плана производства, финансового плана и плана организационно-технических мероприятий на 2017 год.

6. Избрание членов Наблюдательного совета общества.

7. Избрание членов ревизионной комиссии общества.

8. Утверждение размеров вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

9. О внесении изменений и дополнений в Устав СП ЗАО «МХЗ» и принятии его в новой редакции.

Начало регистрации участников собрания в 13.00. Окончание регистрации в 13.50.
Место проведения собрания: г. Могилев, пр. Шмидта, 114 (актовый зал).
Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг СП ЗАО «МХЗ» для составления списка лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, – 01 марта 2017 г.
Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 4 марта 2017 г., а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, – начиная с 17 марта 2017 г.
Регистрация производится при предъявлении документа, удостоверяющего личность, для представителя акционера – паспорт и доверенность.

УНП 700210051
Наблюдательный совет

УНП 600013280
Уважаемые акционеры
ОАО «ИНСТИТУТ
«МИНСКГРАЖДАНПРОЕКТ»
30 марта 2017 года
состоится годовое общее собрание акционеров
ОАО «Институт «Минскгражданпроект»

Место нахождения: г. Минск, ул. Коллекторная, 20а.
Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 20а, конференц-зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:
1. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2016 году.
2. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2016 году и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
3. О результатах аудита и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса Общества.
5. О распределении прибыли и выплате дивидендов за 2016 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2016 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. Внесение изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 20а, ком. 301 (приемная) с 20 по 29 марта 2017 года (время работы с 10.00 до 16.00) либо 30 марта по месту проведения собрания.
Регистрация участников собрания с 14.30 до 15.00 по месту проведения собрания.
Начало работы собрания – 30 марта 2017 года, 15.00.
Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на «10» марта 2017 года.
Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру общества (физическое лицо) – паспорт; руководителю юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение и паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.
Наблюдательный совет ОАО «Институт «Минскгражданпроект»

ООО «Центр Белинвентаризация»

г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**
- ✓ **Оценка всех видов собственности**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА УНИТАРНОГО ПРОИЗВОДСТВЕННОГО ПРЕДПРИЯТИЯ «ГОМЕЛЬСКИЙ ЗАВОД ТОРГОВОГО ОБОРУДОВАНИЯ, 8 (0232) 73 24 23

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	Капитальное строение (административное здание) с инв. №350/С-88104, общая площадь – 1013,8 кв. м, (составные части и принадлежности: кирпичный подвал, кирпичные крыльца, кирпичные сходы в подвал), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Текстильная, 10. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000004001213 площадью 0,0709 га	145 000,00 руб.	14 500,00 руб.
2	Капитальное строение (прирельсовый склад №1) с инв. №350/С-88106, общая площадь – 489,2 кв. м, (составные части и принадлежности: кирпичная пристройка площадью 47 кв. м, кирпичная рампа площадью 59 кв. м), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Текстильная, 10/5. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000004001212 площадью 0,5152 га	51 000,00 руб.	5 100,00 руб.

Срок подачи заявления	**По 23 марта 2017 г.** в рабочие дни с 9^{00} до 16^{00} от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время и место проведения аукциона	**27 марта 2017 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 22.02.2017 г.
Условия продажи	Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 15 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Срок оплаты: определяется по согласованию с собственником имущества при заключении договора купли-продажи. Победитель аукциона в течение 3 месяцев с момента регистрации перехода права собственности на объекты продажи по лоту №1 и по лоту №2 обязан согласовать и вступить в долевое право пользования на земельный участок с кадастровым №340100000004001296, расположенный по адресу: г. Гомель, ул. Текстильная, 10, площадью 0,2094 га, назначение – земельный участок для организации проезда общего пользования по ул. Текстильной, 10. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Для участия в аукционе необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация»

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45

ИЗВЕЩЕНИЕ

Мотыкальский сельский исполнительный комитет Брестского района (организатор аукциона) извещает о проведении 28 марта 2017 года открытого аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

№ лота	Местоположение земельного участка и кадастровый номер земельного участка	Характеристика участка	Площадь, га	Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на изготовление земельно-кадастровой документации и регистрацию земельного участка, руб.	Целевое назначение земельного участка
1	Брестская обл., Брестский р-н, д. Скоки, переулок Солнечный, 1 №121283006601000496	**Земельный участок площадью 0,15 га. Земельный участок на площади 0,0014 га имеет ограничения в использовании земель. Вид ограничений: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт. Строительство электро- и газоснабжения за счет застройщика**	0,15	7000	700	1290 рублей + возмещение расходов на объявления в СМИ о проведении аукциона согласно акту выполненных работ	строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома

Аукцион будет проводиться 28.03.2017 г. в 10.00 по адресу: Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 (здание сельисполкома)

Для участия в аукционе гражданин со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 22 марта 2017 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 документы:**

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона (1800,00 белорусских рублей 00 копеек на расчетный счет Мотыкальского сельисполкома, №3641000000275 в филиал №100 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Брест, код 246, с назначением платежа «Задаток за земельный участок, с отметкой банка о его исполнении;

При подачи документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны**: (8-0162) 949 -135, (8-029) 761-92-84**

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. №462.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на пять процентов, обязан:

Подписать протокол в день проведения аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок на счет ГУ МФ РБ по Брестской области, бюджет Мотыкальского сельисполкома, №3600213060057 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Минск , код 795 , назначение платежа 04901, УНП 200676206;

возместить затраты на организацию и проведения аукциона, в том числе расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, на расчетный счет ГУ МФ РБ по Брестской области, бюджет Мотыкальского сельисполкома, №36002130600057 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Брест, код 795, назначение платежа 04616, УНН 200676206;

приступить к занятию земельного участка в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство жилого дома, но не позднее одного года с момента государственной регистрации права частной собственности на земельный участок, также возместить затраты на строительство, проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к данному земельному участку согласно Постановлению Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. №298;

осуществить строительство электроснабжения и газоснабжения за **свой счет** согласно предоставленным техническим условиям филиала «Брестские электрические сети» РУП «Брестэнерго» от 31.05.2016 №04/243 и филиала «Брестское производственное управление» (ПУ Брестгаз) от 06.06.2016 г. №02-07/61/ТУ

Извещение о проведении 14 марта 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

№	Наименование	Инв. номер	Местонахождение	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1	Зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1980	4220623	г. Минск, ул. Социалистическая, 2	12 296,78	1 220,00
2	Станок универсальный заточной мод. 3Е642Е, год выпуска – 1991	4250051		2 640,00	264,00

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

